Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 7 (5983) | 9 студзеня 1938 г., нядзеля | ЦАНА 10 КАП.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

Шырэй размах палітычнай работы на вёсцы!

ПЕРАДАВЫ АРТЫКУЛ. — Па-большэвіцку арганізаваць загатоўку і вывазку лесу!

АРТЫКУЛЫ:

К. Кісялёў — Ліквідаваць вынікі шкодніцтва ў ахове здароўя.

І. Смольскі — Хто кіруе Белкаапромсоветам.

Маркін — Замацаваць палітработу ў масах.

А. Лось — Дрэнна ачышчаюць насенне.

С. Брайнін — Безгаспадарчасць, якая мяжуе са шкодніцтвам.

П. Старавыбарны. — Староннія назіральнікі.

П. Віхроў — У школах Менска ўсё яшчэ арудуюць ворагі.

Закрылася куставая нарада работнікаў мясцовай прамысловасці.

Усебеларуская нарада актыва работнікаў аховы здароўя.

ЗА РУБЯЖОМ:

На франтах у Іспаніі. — Затапленне французскага парахода. — Сотні тысяч людзей без прытулку. — Забастоўкі рабочых у Польшчы. — Праследванне нацыянальных меншасцей у Румыніі. — Ваенныя дзеянні ў Кітаі. — Новы канфлікт паміж Англіяй і Японіяй. — Зверствы японскіх акупантаў.

ПА-БОЛЬШЭВІЦКУ АРГАНІЗАВАЦЬ ЗАГАТОЎКУ І ВЫВАЗКУ ЛЕСУ!

Лясная прамысловасць БССР ёсць адна з тых галін, у якой ворагі народа выключна многа нашкодзілі. Фашысцкія агенты, якія арудавалі доўгі час на Беларусі, асноўную сваю шкодніцкую дзейнасць у лясной прамысловасці накіроўвалі на драпежніцкае знішчэнне лясных багаццяў рэспублікі, дэзарганізацыю лесазагатовак і вывазкі, зрыў механізацыі і ўсіх мерапрыемстваў па тэхніцы безапаснасці і ахове працы.

Ганебны правал плана лесазагатовак і вывазкі ў 1937 годзе (71 проц.) сведчыць аб тым, што і дагэтуль кіраўнікі Наркомлеса, Лесбела і леспрамгасаў яшчэ не ўзяліся па-сапраўднаму за ліквідацыю вынікаў шкодніцтва і што на радзе ўчасткаў шкодніцтва прадаўжаецца.

Правал плана лесазагатовак 1937 года стварыў выключна напружанае становішча на дрэваапрацоўчых, запалкавых і фанерных заводах. Дастаткова сказаць, што запалкавая фабрыка імя Кірава ў Барысаве, дзе працуе каля 2.000 рабочых, сістэматычна прастойвае, што буйнейшы Бабруйскі лесакамбінат працуе таксама з выключнымі перабоямі. Ворагі народа, шкодзячы ў лесазагатоўках, ставілі сваёй задачай сарваць работу і драваапрацоўчых прадпрыемстваў, будаўніцтва і інш.

17 снежня 1937 года ЦК КП(б)Б заслухаў даклады Наркомлеса і Лесбела аб ліквідацыі вынікаў шкодніцтва ў лясной прамысловасці. ЦК КП(б)Б устанавіў, што Лесбел і леспрамгасы не забяспечылі выканання пастановы СНК СССР ад 29 верасня 1937 года аб плане асеннезімовых лесазагатовак на 1937-38 гг. і аб мерапрыемствах па іх ажыццяўленню. ЦК патрабаваў ад работнікаў лясной прамысловасці прыняцця рашучых мер, каб у бліжэйшы час былі поўнасцю ліквідаваны вынікі шкодніцтва ў іх сістэме.

Аднак, становішча спраў не дае падставы заявіць, што кіраўнікі лясной прамысловасці зрабілі патрэбныя вывады. Прайшло вось ужо 8 дзён студзеня 1938 года, а план лесазагатовак усё яшчэ ганебна зрываецца. У першай пяцідзённы студзеня па Лесбелу ўсяго вывезена 66 тысяч кубаметраў лесу, замест плана ў 166 тысяч. Характэрна, што ў пачатку студзеня тэмпы вывазкі лесу замест павышэння ўдвая зменшыліся ў параўнанні з апаведным перыядам канца снежня 1937 года.

Рад сакратароў райкомаў партыі і старшынь райвыканкомаў (Церахоўка, Берэзіна і інш.) да апошняга часу астаюцца ў баку ад выканання важнейшага дзяржаўнага задання і не дапамагаюць леспрамгасам у арганізацыі лесавывазкі. Асіпавіцкі раён у першай пяцідзённы студзеня пры заданні 10,8 тысяч кубаметраў вывез усяго толькі 2,8 тысячы кубаметраў, Гомельскі раён — апавешча — 5,8 і 1,8 тысяч кубаметраў. Такое-ж, прыкладна, становішча ў Крупскім, Клічаўскім, Рачыцкім і Полацкім раёнах. Сур'ёзна адстаюць таксама Граскі і Менскі раёны.

У чым прычыны ганебнай работы лясной прамысловасці БССР?

Асноўныя прычыны ў тым, што Наркомлес Беларусі і Лесбел да гэтага часу не сталі баявым штабам кіраўніцтва лесазагатоўкамі і вывазкай.

«Звязда» не раз сігналізавала аб тым, што сістэма Лесбела засмечана класава-варожымі элементамі, што ў радзе леспрамгасаў арудуюць трацкісцка-правыя бандыты, што былы дырэктар Лесбела Рэсін пакрывае ворагаў. Аднак нарком тав. Рыжыкаў не зрабіў з гэтага патрэбных вываду. У рэзультаце — правал работы. Сарвана заключэнне дагавораў з калгасамі і калгаснікамі. Вылатныя механізмы — трактары, аўтамашыны і інш. — скарыстоўваюцца варварска. Яны больш прастойваюць, чым працуюць. Не спыняюцца аварыі. Лучковая піла, перавага якой перад звычайнай даказана жыццём, не ўкараняецца на лесазагатоўках. Стаханаўскія метады лесарубаў і возчыкаў не пашыраюцца. Ніхто не займаецца правільнай арганізацыяй працы ў лесе. Аб стварэнні нармальных культурна-бытавых умоў на лесаўчастках не клапоцяцца. Кіраўнікі леспрамгасаў забываюць, што зараз наш калгаснік, гэта — чалавек, які ў сябе ў калгасе жыве культурна і заможна. Ён мае права патрабаваць добрага культурнага абслугоўвання і стварэння нармальных бытавых умоў і ў лесе. Хіба не ганьба для кіраўнікоў Уздзенскага леспрамгаса, калі выехаўшыя ў Ракашыцкі лесаўчастак калгаснікі былі вымушаны вярнуцца назад, бо не знайшлі элементарных умоў для работы.

Усе гэтыя бясчынствы перапіць Наркомлес. Не алічваецца, каб ён па-большэвіцку ўзяўся за навядзенне парадку ў сваёй сістэме.

Зусім нецярпімы абыякавыя адносіны да выканання важнейшага дзяржаўнага задання з боку ряду раённых партыйных і савецкіх арганізацый. Леспрамгасы, райкомы і райвыканкомы, сельсоветы і калгасы павінны неадкладна прыняць самыя энергічныя меры, каб літаральна ў бліжэйшыя-ж дні лабіша рэзкага палняцця тэмпаў работы ў лесе. Неабходна распрацаваць дакладны графік работы на кожны дзень, які забяспечыў-бы поўнае і ў тэрмін выкананне вызначаных планаў.

Студзень — найбольш спрыяючы месяц для лесазагатовак і вывазкі. Таму трэба максімальна скарыстаць гэты месяц, які, па сутнасці, вырашае поспех квартальнага і гадавога плана.

Работнікі лесазагатоўчых арганізацый павінны памятаць, што ад таго, як будзе выканан план лесазагатовак і вывазкі, будзе залежаць поспех работы дрэваапрацоўчых, запалкавых і фанерных прадпрыемстваў БССР, на якіх ідзе дзейная падрыхтоўка да правядзення ў бліжэйшы час стаханаўскага месячніка. Няма сумнення, што рэзультаты стаханаўскага месячніка, работа тысяч стаханаўцаў будзе знаходзіцца ў прамой залежнасці ад забеспячэння сыравінай, ад выканання плана па лесазагатоўках і вывазках.

Далейшае адставанне лясной прамысловасці не можа быць цярпімым. У бліжэйшыя дні павінен быць дасягнут рашучы ўздым тэмпаў работы. Толькі па канкрэтных рэзультатах выканання плана загатовак і вывазкі лесу партыя будзе судзіць аб здольнасці кіраўнікоў лесазагатоўчых і раённых арганізацый па-сапраўднаму змагацца за ліквідацыю вынікаў шкодніцтва, за выкананне важнейшага дзяржаўнага задання.

НА ФРАНТАХ У ІСПАНІІ

УСХОДНІ (АРАГОНСКІ) ФРОНТ

Як паведамляе агенцтва Гавас, мяцежнікі ўзмацнілі атакі ў раёнах Канкуда і Муэла дэ Тэруэль. Усе гэтыя атакі сустрэлі энергічнае супраціўленне рэспубліканцаў. У раёне на паўднёвы захад ад Тэруэля рэспубліканцы перайшлі ў контратаку і занялі пазіцыі, якія забяспечваюць ім панаванне над дарогай Вільястар—Тэруэль.

У сектары Муэла дэ Тэруэль рэспубліканскія войскі зрабілі контратаку і адваявалі некалькі вышынь. Мяцежнікі панеслі значныя страты.

Не гледзячы на холад і снегапад, атрады сапёраў працавалі да наступлення ночы, будуючы ўмацаванні, якія дазволяць рэспубліканскім войскам адбіваць атакі мяцежнікаў.

Як паведамляе іспанскае міністэрства абароны, 8 студзеня раніцою мяцежнікі атакавалі пазіцыі рэспубліканцаў у раёне Лас Селадас. Рэспубліканскія войскі энергічна адбілі гэту атаку. Наступ рэспубліканскіх войск у сектары Муэла дэ Тэруэль прадаўжаўся з вялікім поспехам.

Затапленне французскага парахода

ПАРЫЖ, 7 студзеня. (БЕЛТА). Агенцтва Эспань паведамляе з Марселя, што французскі параход «Гуаружа», належачы кампаніі морскага транспарта, у ноч на 3 студзеня падвёргся бамбардыроўцы з боку «невядомага самалёта» каля вострава Майорка. У рэзультаце бамбардыроўкі параход разламаўся надвое. З каманды парахода 19 чалавек ранена, галоўны механік забіт.

СОТНІ ТЫСЯЧ ЛЮДЗЕЙ БЕЗ ПРЫТУЛКУ

ВАРШАВА, 8 студзеня. (БЕЛТА). Газета «Ілюстраваны курэр цодзенны» паведамляе, што з агульнага ліку насельніцтва Польшчы (каля 32 мільёнаў чалавек) у 1931 годзе было зарэгістравана 295.327 бяздомных, у тым ліку ў гарадах 207.293, а ў вёсках — 88.034.

Газета ўказвае, што з 1931 года становішча не палепшылася. «Бяздомныя,— піша газета, — гэта, у першую чаргу, гарадская беднота, знясіленая крызісам, гэта масы беспрацоўных, якія туляцца ў гарадскіх закавулках і пячорах, ямах, канурах, поўразбураных цагельных заводах і пакінутых разбураных фабрычных будынках. Масы, пазбаўленыя прытулку ў вёсцы, — гэта вясковыя саматужнікі, беззямельныя сяляне, батракі, якія жывуць у канюшнях, хлявах і свірнах».

Газета адзначае, што жыллёвыя ўмовы асабліва цяжкія ў цэнтральнай Польшчы і на так званых усходніх і паўночна-ўсходніх украінах краіны.

«Не газорачы ўжо аб вёсцы, — прадаўжае газета,—жыццёвы ўзровень якой наогул вельмі нізкі, мы хочам звярнуць увагу на жахлівыя жыллёвыя ўмовы ў гарадах Польшчы. Прыведзеныя факты газорыць аб вялікім збядненні гарадскога насельніцтва».

Забастоўка рабочых у Польшчы

ВАРШАВА, 7 студзеня. (БЕЛТА). Па паведамленню газет, забастоўка 600 рабочых цынкавага завода ў Велноўсы (Верхняя Сілезія) прадаўжаецца ўжо адзінаццаты дзень. Бастуючыя ўвесь час займаюць фабрычныя будынкі. У сувязі з тым, што дырэкцыя завода адхіліла патрабаванні рабочых, 4 студзеня бастуючыя пачалі галадоўку. 14 рабочых, змораных галадоўкай, адпраўлены ў шпіталь. Тэрыторыя завода ачэплена паліцыяй.

Праследванні нацыянальных меншасцей у Румыніі

ВЕНА, 7 студзеня. (БЕЛТА). Друк паведамляе, што, побач з антысеміцкімі мерамі па гітлераўскаму ўзору, румынскі ўрад праводзіць рад рэакцыйных мер супроць усіх пражываючых у Румыніі нацыянальных меншасцей. У сувязі з гэтым сярод венгерскай нацыянальнай меншасці ў Румыніі панае паніка. Гаспадарчае жыццё ў населеных венграмі раёнах паралізавана.

Па паведамленню швейцарскага друку, праследванне нацыянальных меншасцей новым румынскім урадам, а таксама яго антысеміцкія меры выклікаюць вялікае незадаволенне ў колах Лігі нацый. Там падкрэсліваюць, што гэтымі мерамі грубя парушаецца парыжскі дагавор ад 9 снежня 1919 года, заключаны паміж дзяржавамі Антанты і Румыніяй. Па гэтаму дагавору Румынія абавязалася прадаставіць усім жыхарам поўную абарону жыцця і свабоды, незалежна ад паходжання, нацыянальнасці, мовы, расы і рэлігіі, а таксама права на свабоднае выкананне культаў.



Нікалай Іосіфавіч СУГАНЯКА, дэпутат Савета Саюза Вярхоўнага Савета СССР ад Мазырскай выбарчай акругі.

УСЕБЕЛАРУСКАЯ НАРАДА АКТЫВА РАБОТНІКАЎ АХОВЫ ЗДАРОЎЯ

Учора ў менскім Доме партактыва адкрылася ўсебеларуская нарада актыва работнікаў аховы здароўя БССР. На нарадзе прысутнічае звыш 500 чалавек — работнікаў наркамата, раённых і акруговых аддзелаў аховы здароўя, галоўныя ўрачы больніц, медыцынскія сёстры, прафесары, навуковыя работнікі і інш.

Прысутныя з велізарным натхненнем выбралі ганаровы прэзідыум у складзе членаў Палітбюро ЦК ВКП(б) на чале з любімым правадыром народаў таварышам Сталіным, а таксама тт. Дзімітрава, Тэльмана і Хозэ Дыяса. Прыліў энтузіязма нарастае з новай сілай, калі прымаецца прывітанне таварышу Сталіну. Уся зала ўстае. Доўга не змаўкаюць бурныя авацыі.

З дакладам аб становішчы аховы здароўя ў БССР і задачах на 1938 год выступіў нарком аховы здароўя БССР тав. Кісялёў. Сёння на нарадзе будуць спрэчкі па дакладу наркома.

МАСКОЎСКАЯ АБЛАСНАЯ РАБСЕЛЬКОРАЎСКАЯ НАРАДА

7 студзеня ў Маскве, у памяшканні клуба НКВД, адбылася нарада рабселькораў горада Масквы і Маскоўскай вобласці. У нарадзе прынялі ўдзел 1.500 рабкораў, селькораў, заенкораў, рэдактараў раённых, фабрычна-заводскіх і насценных газет.

Пасля кароткага ўступнага слова сакратара МК ВКП(б) тав. Дзедзікава выступіў з дакладам аб выніках работы друку ў выбарчай кампаніі і яго далейшых задачах загадчык аддзелам друку і выдавецтваў ЦК ВКП(б) тав. Нікіцін.

У спрэчках па дакладу выступіла звыш 30 далегатаў, у тым ліку дэпутат Вярхоўнага Савета СССР тав. Сідараў, рабкор тав. Карсакова, селькор тав. Іўлічэў, ваенкор тав. Ільічоў, хатняя гаспадыня таз. Печнікава і іншыя.

Нарада паслала прывітанне таварышу Сталіну.

(«ПРАВДА»).

У МАСКВУ—НА ПЕРШУЮ СЕСІЮ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР

Учора ў Менск пачалі з'язджацца выбраннікі беларускага народа, дэпутаты Вярхоўнага Савета Саюза ССР. Прыбылі Герой Совецкага Саюза тав. Даянісаў С. П., знатная трактарыстка рэспублікі тав. Рачок С. П., пагранічнік тав. Абрамаў А. М., брыгадзір-трактарыст Заслаўскай МТС тав. Значонак І. П., брыгадзір свінафермы соўгаса імя Свердлова тав. Белая Е. В., жывёлавод соўгаса «Завет Ільіча», Быхаўскага раёна, тав. Еўменава С. С., майстар пэха запалкавай фабрыкі імя Кірава ў Барысаве таз. Журанкова Е. С. і інш.

Сёння спецыяльным поездам дэпутаты БССР адпраўляюцца ў Маскву на першую сесію Вярхоўнага Савета СССР.

ЗАКРЫЛАСЯ КУСТАВАЯ НАРАДА РАБОТНІКАЎ МЯСЦОВАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ

Як і ў першы дзень нарады, спрэчкі разгортваліся ў асноўным па пытаннях снабжэння. Ні адзін з выступаўшых дырэктароў прадпрыемстваў не расказаў, што ім намечана канкрэтна па ліквідацыі вынікаў шкодніцтва. Абсалютна нічога не робяць па гэтаму пытанню трэсты і сам наркамат.

Стаханаўцы тт. Гімельштэйн (мечскі завод імя Кірава), Лысенка (магілёўскі трубалітэйны завод), Герасімовіч (цагельны завод № 5) і іншыя спыняліся на тых непаладках, якія перашкаджаюць стаханаўцам у павышэнні іх выпрацоўкі.

— Многа, — гаворыць тав. Гімельштэйн, — займаюцца на нарадах, сходах пустой балбатнёй. Таму часам не хочацца траціць каштоўны час на выслуханне бескарыснай гаварыльні. Пытанне аб майстрах і іх нізкай аплаце ўжо дзесяткі разоў абмяркоўвалася на нарадах. Але да гэтага часу яно не вырашана. Я, напрыклад, зарабляю амаль у тры разы больш за майстра. Таму мы маем многа выпадкаў, калі стаханаўцы адмаўляюцца ад такога роду вылучэння. Пара ўжо наркамату, нарэшце, вырашыць пытанне аб майстрах.

Зусім правільна былі завостраны на нарадзе пытанні аб тэхніцы безапаснасці, ахове працы, жыллёвым будаўніцтве. У гэтай галіне ворагі народа асабліва многа напаскудзілі. Наркаммясцпрому трэба прыняць больш энергічныя меры па хутчэйшай ліквідацыі вынікаў шкодніцтва.

Выступаючыя патрабавалі ад кіраўнікоў трэстаў і наркамата перабудаваць сваю работу, каб кожны дырэктар прадпрыемства атрымаў канкрэтную дапамогу па ўсіх пытаннях вытворчасці і арганізацыі працы.

Была ўнесена прапанова аб далейшым скліканні нарад па асобных галінах прамысловасці, што дасць, безумоўна, больш карысці.

Нарада апрануша, пад бурныя апладысменты паслала прывітальнае пісьмо правадыру народаў вялікаму Сталіну.

Пасля заключнага слова наркома мясцовай прамысловасці тав. Каровіна нарада закончыла сваю работу.

УШАНАВАННЕ ПАМЯЦІ Н. А. НЕКРАСАВА

МАСКВА, 8 студзеня. (БЕЛТА). Усерасійскі Пэнтральны Выканаўчы Камітэт пастанавіў у сувязі з 60-годдзем з дня смерці выдатнейшага рускага паэта Нікалая Алексеевіча Некрасава пераймена-ваць Большэсольскі раён Яраслаўскай вобласці ў Некрасаўскі раён; яго цэнтр: сяло Вялікія Солі — у сяло Некрасаўскае і вёску Грэшнёва тако-ж раёна — у вёску Некрасава.

ШЫРЭЙ РАЗМАХ ПАЛІТЫЧНАЙ РАБОТЫ НА ВЁСЦЫ!

У жыцці нашай вёскі выбарчая кампанія пакінула незгладжальны след. Совецкае сялянства яшчэ раз з незвычайнай сілай адчула свае цесную, неразрыўную сувязь з рабочым класам, з партыяй Леніна—Сталіна. Выбарчая кампанія далучыла да актыўнай палітычнай дзейнасці новыя слаі сялянства, дапамагла вылучэнню з народа таленавітых і бясконца адданых справе партыі агітатараў, прапагандыстаў, арганізатараў. Дзесяткі тысяч гурткоў па вывучэнню Сталінскай Канстытуцыі і зыбарчага закона, гутаркі, чыткі газет, многалюдныя сходы і мітынгі — усё гэта з'явілася выдатнай школай большэвіцкага выхавання мас.

Выбарчая кампанія пакінула вялікі след і ў жыцці вясковых партыйных арганізацый. Яна актывізавала комуністаў на сяле, прымусіла па-новаму зірнуць на акружаючых людзей, дапамагла алкрыць у іх новыя якасці. Калі раней, да выбараў, многія партыйныя арганізацыі бачылі ў калгасніках толькі брыгадзіраў, звенняявых, трактарыстаў ці камбайнераў, то цяпер становішча змянілася.

Вось што, напрыклад, расказвае сакратар Рыбнаўскага райкома ВКП(б), Разанскай вобласці, тав. Басюбін: «Многіх людзей у раёне мы або зусім не ведалі, або ведалі аднабакова... Выбарчая кампанія адкрыла ў гэтых таварышах новыя якасці, невядомыя нам раней. Аказалася, што беспартыйны калгаснік Бялоў — дасканалы арганізатар, ён узорна паставіў работу зыбарчага ўчастка; Грышын, Музалева, Навічкова — умелыя і талковыя агітатары; малады комсамолец Лазарэў — надрэнны прапагандыст...»

Так было ўсюды, дзе партыйныя арганізацыі не замыкаліся ў сваю ўласную шкарлупу, а стараліся ўмацаваць сувязі з беспартыйнымі. Амаль кожная партыйная арганізацыя ў выніку зыбараў абрасла беспартыйным актывам — выдатнымі памочнікамі, з дапамогай якіх можна тварыць літаральна цуды. Якімі нікчэмнымі ў гэтым святле выглядаюць разгаворы некаторых нядбалых кіраўнікоў аб тым, што нехапае, моў, кадраў, цяжка з падборам работнікаў і т. п. Бязрукія людзі! Выдатных, таленавітых, смелых і ініцыятыўных работнікаў, партыйных і непартыйных у нас безліч, трэба толькі іх бачыць і выхоўваць, расчышчаць дарогу для іх росту і вучыць іх.

На мясцах пачалося ўжо вылучэнне новых кадраў актыва. У Калінінскай вобласці тав. Малышэў, старшыня сельсавета, вылучан на пост дырэктара Пролетарскай МТС у Пустошкінскім раёне. Таз. Якаўлеў, старшыня калгаса, стаў дырэктарам 1-й Опачэцкай МТС. У Заходне-Казахстанскай вобласці знатны камбайнер-ордэнаносец Іван Лагвіненка, дэпутат Вярхоўнага Савета СССР, зацверджан дырэктарам МТС. Камбайнер-ордэнаносец Фёдар Колесаў — цяпер старшыня Тоцкага раённага выканкома Оранбургскай вобласці. У Рыбнаўскім раёне, Разанскай вобласці, раённы зямельны аддзел узначальвае таз. Калацілін, які працаваў нядаўна старшынёй калгаса імя Кірава. У тым-жа Рыбнаўскім раёне звыш 40 беспартыйных вылучаны на работу ў сельсоветы, у раённую газету і т. д.

Актыў наш будзе расці не па днях, а па гадзінах, калі партыйныя арганізацыі зробяць усе вывады з вынікаў выбарчай кампаніі. Ні ў якім разе не згортзаць масавай работы, а ўзмацняць яе! Грубейшую памылку зрабілі тыя партыйныя арганізацыі, якія пасля выбараў згарнулі агітацыйна-масавую работу, разгубілі агітатараў, спачылі на лаўрах.

Масавая палітычная агітацыя і прапаганда сярод працоўных — гэта не кампанія, а штодзённая, арганічная работа, заўсёды абавязковая для кожнай большэвіцкай арганізацыі, неабходная для поспехаў социялізма.

Правільную лінію ўзялі тыя партыйныя арганізацыі, якія захавалі сваіх агітатараў на «дзесяцідворках» (гэта форма работы палкам сябе апраўдала), рэгулярна праводзяць гуткаркі з калгаснікамі і калгасніцамі, наладжваюць палітдні, чыткі газет, — словам, увайшлі ў гушчу калгасных мас і вядуць іх за сабой.

Напрамак, зместпалітычнай работы вызначаюцца важнейшымі, галоўнымі зараз задачамі партыі. **Зараз, напрыклад, няма на вёсцы больш важнай задачы, чым разгортванне социялістычнага спаборніцтва калгасаў і соўгасаў за лепшую падрыхтоўку да веснавой сяўбы.** Недарма Пэнтральны Камітэт партыі і Урад у сваёй нядаўняй пастанове аб падрыхтоўцы да веснавой сяўбы абазвалі ўсе совецкія і партыйныя арганізацыі:

«Арганізаваць шырока і з належным штодзённым кіраўніцтвам спаборніцтва калгасаў і соўгасаў за лепшую падрыхтоўку да веснавой сяўбы. Звярнуць асаблівую ўвагу на ўмацаванне жывой сувязі партыйных арганізацый з калгасным актывам і стаханаўцамі».

Гэта значыць, што ўсе партыйныя арганізацыі, усе нашы работнікі павінны адаць свае сілы і ўвагу перадпасеўнай падрыхтоўцы. Партыйная арганізацыя толькі тады здолее ўзначаліць социялістычнае спаборніцтва, калі яна раскажа, растлумачыць кожнаму калгаснику значэнне і мэту гэтага спаборніцтва, калі яна здолее падняць ярасць мас супроць перашкаджаючых, шкодзячых сяўбе, калі на прыкладзе перадавых калгасаў і стаханаўцаў яна пакажа зацікаўленасць калгаснікаў у зыдатнай падрыхтоўцы да сяўбы. Калгасны актыў, стаханаўцы павінны будуць адыграць велізарную ролю. Партыйная арганізацыя абавязана згуртаваць гэты актыў і зрабіць яго перадавым атрадам барацьбітоў за высокі ўраджай.

Задачы партыйных арганізацый ні у якім разе не вычэрпваюцца агітацыйнай работай. Арганізаваць спаборніцтва — значыць не толькі растлумачыць яго значэнне, але і забяспечыць яго поспех. Для гэтага трэба ўвайсці ва ўсе дэталі вытворчасці, вывучыць стан рамонту трактараў, ведаць, што затрымлівае засыпку і ачыстку насення, што тармозіць выбарку гаручага і збор мясцовых угнаенняў, у якім становішчы знаходзіцца складанне вытворчых планаў і т. д. Давядзецца, значыць, заняцца сельскай гаспадаркай, аж да «дробязей», ведаць гэтую гаспадарку і адказваць за яе.

У жыцці, на практыцы, вучыць таварыш Сталін, палітыка і гаспадарка неадлучны. «Яны існуюць разам і дзейнічаюць разам. І той, хто думае ў нашай практычнай рабоце аддзяліць гаспадарку ад палітыкі, узмацніць гаспадарчую работу цаной умалення палітычнай работы ці, наадварот, узмацніць палітычную работу цаной умалення гаспадарчай работы, — той абавязкова пападае ў тупік».

Партыйны кіраўнік павінен правільна спалучыць палітычнае кіраўніцтва з гаспадарчым.

Трэба поўнасцю ўсвоіць метад большэвіцкага кіраўніцтва гаспадарчымі органамі, сістэматычна дапамагаць гэтым органам, умацоўваць іх праверанымі работнікамі, не падмяняць і не абязлічваць іх. Цэнтральны Камітэт партыі і Урад асаблівую ўвагу звярнулі на ўкамплектаванне ўсіх машынна-трактарных станцый і майстэрань, а таксама раённых зямельных аддзелаў праверанымі кіруючымі работнікамі. Выкананне гэтай задачы будзе сур'ёзнай праверкай партыйных арганізацый, праверкай іх умення кіраваць у новых умовах.

Нашы сельскагаспадарчыя органы грунтоўна ачышчаюцца ад трацкісцка-бухарынскіх шпіёнаў — гэтых заклятых ворагаў народа, якія рыхтавалі голад і памешчыцкае ярмо для калгаснага сялянства. Але яшчэ ёсць, яшчэ дзейнічаюць варожыя карэнчыкі, і мы ні на мінуту не павінны паслабляць пільнасць, не можам дапусціць ні малейшага праяўлення палітычнай бесклапотнасці. Авалоданне большэвізмам, зоркае палітычнае вока, уменне выкрываць і знішчаць ворагаў — вось што патрэбна ўсім нашым работнікам, партыйным і беспартыйным.

Веснавая сяўба 1938 года нясе на сабе многія новыя рысы. У гэтым годзе мы ўпчыльную падыйдзем да поўнага ажыццяўлення лозунга таварыша Сталіна аб 7—8 мільярдах пудоў зярна. Новыя мільёны калгаснікаў павінны прысці да заможнага жыцця. Новыя поспехі трэба зрабіць на шляху да задавальнення багацця прадуктаў. Вырашэнне гэтых задач магчыма толькі на аснове шырокага социялістычнага спаборніцтва калгасаў і соўгасаў, на аснове новага ўздыму стаханаўскага руху. Наша палітычная работа на вёсцы павінна забяспечыць небывалы росквіт сельскай гаспадаркі, яшчэ большае згуртаванне мільённых мас калгаснікаў і калгасніц вакол пераможнага сцяга Леніна—Сталіна.

«ПРАВДА».

ЛІКВІДАВАЦЬ АДСТАВАННЕ Ў ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА СЯЎБЫ

СПАБОРНІЦТВА Ў БРЫГАДЗЕ

ЧАШНІКІ. (БЕЛТА). Калгаснікі калгаса «Жэрына», Ліззукаўскага сельсовета, сабраліся 6 студзеня на агульны сход для абмеркавання пастановы Соўнаркома СССР і ЦК ВКП(б) аб падрыхтоўцы да сяўбы.

Пасля зачытання пастановы першае слова бярэ брыгадзір Веранёў.

— Той факт, што нашым калгасам кіруе дэпутат Вярхоўнага Совета Елізавета Ігнацьеўна Папкова, — гаворыць тав. Веранёў, — абавязвае нас быць перадавымі па падрыхтоўцы да сяўбы не толькі па раёну, але і па ўсёй акрузе. Перад ад'ездам тав. Папковай на першую сесію Вярхоўнага Совета мы павінны сказаць ёй аб нашых самаабавязацельствах па ўзнёсшую ўраджайнасці ў гэтым годзе. Наша брыгада ў 1938 годзе будзе змагацца за 25—30 цнт. зернавых з гектара, 6 цнт. ільнавалакна, 8—9 цнт. ільнасемя, 250—300 цнт. бульбы з гектара. Гэтыя лічбы — зусім рэальныя для нашага калгаса.

— Каб атрымаць сталінскі ўраджай, — прадаўжае тав. Веранёў, — наша брыгада пачала рыхтавацца яшчэ з восені. Вывезлі частку гною пад зяблезае ворыва. План зяблевага ворыва выканалі поўнасцю. Гною і торфу мы зывезлі на палі 22 тыс. пудоў. Вывезена са станцыі 7 тон мінеральнага ўгнаення. Калгаснікі збіраюць попел і курыны памёт. Тэрмін сяўбы мы ўстанавілі — 10 дзён. Выклікаем на соцспаборніцтва другую брыгаду тав. Папкова Карнея.

Брыгадзірам тав. Папкоў Карней працуе толькі 3 месяцы, але ён упаўнека прыняў выклік першай брыгады, бо яму ў рабоце дапамагаюць калгаснікі-стахановцы.

Агульны сход калгаснікаў адналушна ўхзаліў узятыя брыгадамі абавязацельствы. У калгасе разгортваецца соцспаборніцтва за рэкордны ўраджай 1938 года.

Выступіўшая на сходзе дэпутат Вярхоўнага Совета Елізавета Ігнацьеўна Папкова заявіла:

— Нам, тазарышы калгаснікі, трэба памятаць словы таварыша Сталіна, што ў большэвікоў слова не павінна разыходзіцца са справай. Алсюль наша задача — з патроенай энергіяй узяцца за работу, змагацца за сталінскі ўраджай, разгарнуць социялістычнае спаборніцтва за ўзорнае праходжэнне веснавой сяўбы.

Калгас «Жэрына» выклікаў на соцспаборніцтва калгас «Чырвоны спяг». Вылучана камісія па праверцы выканання ўзятых абавязацельстваў.

ДРЭННА АЧЫСЧАЮЦЬ НАСЕННЕ

Уваравіцкі раён адзін з адстаючых у рэспубліцы па падрыхтоўцы да веснавой сяўбы. Да апошняга часу па калгасах не скончана малацьба. У снапах знаходзіцца каля 1200 тон зернавых, што складае больш 12 проц. ураджаю. Калгас «Чырвоная Беліца» не абмалаціў збожжа з плошчы 250 гектараў і ні аднаго кілограма насення не засыпаў для веснавой сяўбы. Старшыня гэтага калгаса Рэмаў злачынна зрывае падрыхтоўку насення. У калгасе «Рухавік» таксама не абмалочана зернавых з плошчы 180 гектараў. Ужо месяц у гэтым калгасе стаяць дзве малатарні Уваравіцкай МТС, а малацьба не праводзіцца.

Такіх калгасаў у раёне налічваецца больш 10. Недапушчальна запягнуўся абмалот, зрываецца засыпка насення. Па ўсіх калгасах у насенны фонд засыпана зернавых толькі 83 проц. У асобных сельсоветах і калгасах становішча яшчэ горшае. Зрываецца таксама ачыстка насення. Праз трыер прапушчана толькі 17 проц. засыпанага. Ачыстку правялі толькі лічаныя калгасы. У буйнейшым калгасе «Чырвоны шлях», дзе ёсць 4 трыеры, ні адзін з іх не працуе. Стаяць машыны і ў іншых калгасах.

Раённы зямельны аддзел нават не ведае колькі ў калгасах ёсць трыераў.

Дрэнна праводзіцца рамонт трактараў. Па Уваравіцкай і Будашчанскай МТС хоць план рамонту нібы выконваецца, але якасць яго зусім нізкая. 16 трактараў Будашчанскай МТС пасля рамонту стаяць у грязі, ржавеюць. Ва Уваравіцкай МТС у адрамантаваных трактарах выяўляецца многа дэфектаў.

Машынна-трактарныя станцыі зусім не прыступілі ў гэтым месяцы да вывазкі гаручага, адкладаючы гэту работу на вясну.

Вывазка мінеральнага ўгнаення таксама не арганізавана. На станцыі Узла пад адкрытым небам валяецца 50 тон угнаення, якое начальнік станцыі Новікаў выгрузіў пад адкос, у той час як склад пусты. Калгасы «Першае мая», «Вольная праца», «Новае жыццё» не выкупілі ні аднаго кілограма ўгнаенняў. Да загатоўкі мясцовых угнаенняў не прыступіў яшчэ ні адзін калгас у раёне.

Райком партыі і райвыканком зусім не займаюцца падрыхтоўкай да сяўбы. Нават пасля рашэння СНК СССР і ЦК ВКП(б) сакратар райкома т. Куксін не зрабіў для сябе ніякага вываду. Райком усклаў усю работу па падрыхтоўцы да сяўбы на раённы зямельны аддзел, а зямельны аддзел у сваю чаргу ўсю работу звальвае на МТС. Аграномы, якіх у раёне 11 чалавек, сядзяць у канцылярыях і толькі склаюць «мерапрыемствы». Ад калгасаў яны адарваны, не працуюць са стахановцамі, не арганізоўваюць агратэхвучобы з калгаснікамі.

Райком партыі, райвыканком адгарадзіліся ад калгасаў, не кіруюць падрыхтоўкай да сяўбы.

А. ЛОСЬ.

БЕЗГАСПАДАРЧАСЦЬ, ЯКАЯ МЯЖУЕ СА ШКОДНІЦТВАМ

БЕШАНКОВІЧЫ. (Кар. «Звязды»). Вакол майстэрні Бешанковіцкай МТС параскіданы засыпаныя снегам трактарныя плугі, бораны, культываторы і іншы сельскагаспадарчы інвентар. Павеці для машын няма. Каштоўны інвентар знаходзіцца ў безгаспадарчым стане, іржавее і псуецца.

У самой майстэрні халодна, чадна і брудна. Рабочыя працуюць у зімовай вопратцы. Назокал — друд і копаць. У такарным цэху працуе толькі адзін такарны станок. Другі такарны станок і станкі свідравальны, для прыпальвання, для расточкі цыліндраў на працягу некалькіх месяцаў стаяць без руху.

У майстэрні адсутнічае арганізацыя працы. Стары рабочы-токар т. Жыгун гарыць жаданнем працаваць ударна. Але ў майстэрні не створаны ўмовы для ўдарнай стахановскай працы. У адзіным працуючым такарным станку і то няспраўны патрон. Адсутнічаюць таксама разцы. Запасныя часткі да рабочага месца не дастаўляюцца. За кожнай драбніцай прыходзіцца бегаць, шукаць яе, траціць шмат часу.

Брыгады па рамонту трактараў укамплектаваны толькі днямі і то не поўнасцю. З першых дзён работы алчуваецца найнейшая адсутнасць дысцыпліны. Вось адзін з многіх прыкладаў. Брыгада, якою кіруе тав. Пясоцкі, складаецца з трох чалавек. Але ні аднаго дня брыгада яшчэ не працавала ў поўным складзе. Абавязкова хто-небудзь прагульвае. Дрэнная арганізацыя працы і частыя прагулы характэрны і для астатніх брыгад. Што датычыць спажэнняў на работу, то тут гэта ўвайшло ў сістэму. Брыгадзір т. Пясоцкі скарэдзіцца на адсутнасць ключоў, малаткоў і нясвоечасовае забеспячэнне запаснымі часткамі.

Да голасу рабочых дырэкцыя МТС не прыслухоўваецца. Колькі раз патрабаваў рабочы па рамонту матораў тав. Балтовіч забяспечыць іх цэх цыгелем для разагрэву бабіту, але яго патрабаванне астаецца незадаволеным і рабочым даводзіцца прыбягаць да ручных горнаў, што алымае шмат каштоўнага часу і зніжае прадукцыйнасць працы.

У майстэрні даўно можна было пабудаваць тамбур для заводкі матораў і абкаткі трактараў. На гэтую справу адпушчаны грошы, закладзен нават фундамент, ёсць неабходны лес і ўсё-ж тамбур не будуецца. Заводка матораў робіцца ў цэху зборкі трактараў, і рабочыя чадзеюць ад дыму, якім напаўняецца ўвесь цэх. Вентыляцыі ў цэху няма.

Адсутнасць пвёрдага графіка работ, норм выпрацоўкі, адсутнасць клопатаў аб рабочых (у майстэрні няма нават гатаванай вады, аптэчкі і г. д.) — усё гэта перашкаджае рабочым нармальна працаваць.

На наша запытанне, колькі ёсць у майстэрні ўдарнікаў і стахановцаў, мы атрымалі ад дырэктара МТС адказ:

— На жаль, у нас такіх няма.

Пры аглядзе трактараў, якія значацца па акту адрамантаванымі і прынятымі, выявілася, што ў гэтых «адрамантаваных» трактарах адсутнічаюць рэборды да калёс, слаба падцягнуты падшыпнікі, з-за чаго хістаюцца перадкі. Некалькі трактараў яшчэ не прайшлі пракаткі. Ясна, што ў такім выглядзе іх лічыць адрамантаванымі нельга.

У МТС і МТМ доўгі час арудавалі ворагі народа, якія выводзілі трактары са строю. Пасля выкрыцця гэтых фашысцкіх агентаў раённыя арганізацыі, а таксама і Наркамазем БССР нікога па сутнасці не зрабілі для забеспячэння МТС і МТМ кіруючымі работнікамі. Абавязкі дырэктара МТС выконвае намеснік дырэктара па разліку з калгасамі Новікаў, які выключна дрэнна кіруе ўсёй работай МТС і асабліва рамонтам трактараў. Да гэтага дня ў майстэрні няма старшага механіка не ўкамплектаван склад брыгадзіраў. Няма належнага тэхнічнага кіраўніцтва.

МТС мае вялікую дэбіторскую запазычанасць (звыш 100.000 рублёў), што ёй належыць па натуралпладе ад калгасаў. Не разлічыліся яшчэ з трактарыстамі за палявыя работы. Запазычанасць трактарыстам складае 37.000 рублёў. Раённыя арганізацыі нічога не робяць для таго, каб фарсіраваць разлік калгасаў з МТС.

Становішча з рамонтам трактараў і прычэпнага інвентару астаецца няжкім. Па плану Бешанковіцкая МТС павінна адрамантаваць 49 трактараў, 45 трактарных плугоў і вялікую колькасць іншага прычэпнага інвентару. За ўвесь снежань і 5 дзён студзеня не адрамантован ні адзін трактар, бо 4 трактары, якіх тут лічаць адрамантаванымі, фактычна яшчэ не адрамантаваны.

С. БРАЙНІН.

Дзержынская калгасная школа рыхтуе новае папаўненне калгасных кадраў. На здымку: група паляводаў і жывёлаводаў калгаснай школы слухае лекцыю па агратэхніцы.
Фото Я. Гаравога (БСФ).

ТРЫЕРЫ НЕ НАГРУЖАНЫ

БЯРЭЗІНА. (Спец. кар. «Звязды»). Становішча з падрыхтоўкаю да веснавой сяўбы па Бярэзінскаму раёну выклікае трывогу. Многія калгасы не прыступілі яшчэ да ачысткі насення, рамонту інвентару, падрыхтоўкі цягавай сілы. Гэта яскрава паказала праведзеная гэтымі днямі раённая нарада па пытанню ходу падрыхтоўкі да сяўбы.

Горш за ўсё абстаіць справа з засычкай і ачысткай насення. Насенне засыпана неправеранае, у значнай ступені некандыцыйнае. За ачыстку яго большасць калгасаў узялася толькі цяпер, прычым арганізавана яна выключна дрэнна.

Раён мае 21 трыер. Усе яны сканцэнтраваны ў 4—5 сельсоветах. У Капланіцкім і Камена-Борскім сельсоветах, напрыклад, знаходзіцца амаль палова ўсёй колькасці трыераў. Яны не загружаны. У калгасе «Пераможац» (старшыня Булойчык) сутачная нагрузка трыера не больш 5 гадзін. Такія прыклады можна сустрэць усюды. Як правіла, насенне праз трыер прапускаецца толькі адзін раз і фактычна астаецца неачышчаным.

Раённае кіраўніцтва (сакратар РК КП(б)Б тав. Сосінаў, старшыня РВК тав. Шалапёнак, загалчык райза тав. Гуревіч) нічога сур'ёзнага не зрабіла, каб шырока разгарнуць у калгасах раёна сацыялістычнае спаборніцтва на лепшую падрыхтоўку да веснавой сяўбы.

Т. ХАДКЕВІЧ.

СТАЛІНСКАЯ КАЛОНА ПАРАВОЗАЎ

У Жлобінскім паравозным дэпо арганізована сталінская калона з 5 паравозаў. Машыны вядуць лепшыя машыністы—стахановцы-крываносаўцы дэпо. Сярод іх — машыніст таварнага паравоза «ЭГ-17», член партыі тав. Сулік Емельян. У дні сталінскай дэкады стахановскіх рэкордаў ён вёў поезд з Калінкавіч у Жлобін вагою 1950 тон. Састаў ён правёў з нагонам у пуці на 41 мінуту і дасягнуў тэхнічнай скорасці 39,2 кілометра ў гадзіну. Нядаўна тав. Сулік атрымаў наркомаўскую прэмію.

Машыністы пасажырскага паравоза «ФВ-57» — член партыі тав. Галушка і беспартыйны тав. Вігдорчык — дабіліся добрых рэзультатаў работы. 4 студзеня тав. Вігдорчык вёў поезд з Оўруча ў Жлобін і ў гэтай паездцы меў нагон у пуці на 32 мінуты, павысіўшы тэхнічную скорасць паравоза да 53 кілометраў у гадзіну.

У калону таксама ўваходзяць — комсамольскі паравоз «ЭГ-1303», машыністамі якога з'яўляюцца комсамольцы: ганаровы чыгуначнік тав. Міцько і тав. Алярхновіч; машыністы-крываносаўцы тт. Лавецкі, Брэдзіхін, Калпакоў, Тамкоў і Хаўрэвіч.

У азнаменаванне першай сесіі Вярхоўнага Совета СССР стахановцы-крываносаўцы сталінскай калоны абавязаліся не мець ні адной аварыі, павялічыць прабег паравозаў, працаваць ад прамыўкі да прамыўкі без міжпаязнога рамонту машын, эканоміць паліва і вадзіць пяжкаважкія паязды. Яны паставілі сваёй задачай — ператварыць Жлобінскае дэпо ў перадавое і заваяваць пераходны сцяг Народнага камісарыята шляхоў зносін.

Для папулярызацыі работы сталінскай калоны і перадачы яе вопыту астатнім у дэпо ўстаноўлена добра афармленая дошка, на якой паказваюцца рэзультаты кожнай паездкі.

СТАРОННІЯ НАЗІРАЛЬНІКІ

Выбары Вярхоўнага Совета СССР, праведзеныя на аснове новай Сталінскай Канстытуцыі, паказалі небывалы ў гісторыі ўздым палітычнай актыўнасці працоўных нашай краіны. Свядомасць і разуменне кожным грамадзянінам выбараў, як кроўнай сваёй справы, стваралі імкненні падрыхтавацца да іх як можна лепш.

Палітычна-асветныя ўстановы (дамы соцкультуры, хаты-чытальні, калгасныя клубы і чырвоныя куткі) у разгортванні палітычна-асветнай работы і культурным абслугоўванні рабочых, калгаснікаў і совецкай інтэлігенцыі адыгрывалі вялікую ролю. Асабліва зялікая работа была праведзена ў арганізацыі гурткоў па вывучэнню Сталінскай Канстытуцыі, Палажэння аб выбарах, біяграфій дэпутатаў, матэрыялаў пра дасягненні социялістычнага будаўніцтва. Пры культасветустановах былі арганізаваны кансультацыйна-лаведвыя бюро, чытанне лекцый, дакладаў, работа гурткоў мастацкай самадзейнасці, мастацкага чытання літаратуры і інш.

Аднак, незразуменне яшчэ многімі работнікамі ролі палітычна-асветных устаноў прыводзіць да таго, што культурна-масазую работу лічаць кампанейскай справай і сістэматычна яе не праводзяць.

Зараз у радзе месц пачалі згортваць работу палітычна-асветных устаноў, ухіліліся ад культурнага абслугоўвання працоўных мас. Ёсць цэлы рад прыкладаў нікудышнай работы паасобных хат-чытальняў у вёсках і калгасах. Так, напрыклад, хата-чытальня Забаўскага сельсовета (заг. Гаўрыленка) Будакашалёўскага раёна мае некультурны выгляд. Падлога разбурана, сцены ад макраты пакрыліся плесенню, дах працякае, абсталяванне — усяго два старыя сталы і два крэслы; работа гурткоў адсутнічае, аб арганізацыі культурнага адпачынку калгаснікаў тут не знайшлі часу падумаць.

Цэнтр усёй масавай работы ў раёне — Дом соцкультуры (заг. Галавач)—стварае сумнае ўражанне: будынак, як кажуць, ад ветру валіцца, патрэбен вялікі рамонт. Асігнаваныя сродкі па бюджэту на 1937 год у суме 18 тыс. рублёў асталіся нескарыстанымі. Сакратар РК КП(б)Б тав. Пячонка прама прызнаецца, што райком справаю палітасветработы не займаўся. На працягу апошняга года на пасяджэнні бюро ніколі не разглядалася пытанне аб рабоце палітасветустаноў — хат-чытальняў, калгасных клубаў. Райком не знайшоў часу ў 1937 годзе, каб склікаць нараду загалчыкаў хат-чытальняў. Ігнараванне райкомам партыі гэтай важнейшай работы трэба разглядаць проста як злачынства.

Дрэнна працуюць культустановы і ў Даманазіцкім раёне. Хата-чытальня Ламанавіцкага сельсовета (заг. Верас Д.) у часе падрыхтоўкі да выбараў тое-сёе рабіла, а зараз тут панае паўнейшы занепад усёй масавай работы. Хата-чытальня зачынена цэлымі тыднямі. У Ліпаўскім сельсавеце таксама пасля выбараў хату-чытальню закрылі.

Проста недапушчальным з'явішчам з'яўляецца тое, што ў радзе раёнаў зусім не працуюць культасветустановы. Вось хата-чытальня Жаробіцкага сельсовета Сіроцінскага раёна (заг. Собалеў П.) Культурна-масавая работа тут зусім не наладжана. Нават газеты, выпісваемыя хатай-чытальняй, складаюцца ў шафы пад замок, і калгаснікі не маюць магчымасці пачытаць іх. Хата-чытальня Рудзянскага сельсовета, Расонскага раёна (заг. Рубіс П.), не вабіць калгаснікаў, яна дрэнна абсталявана. Культінвентар чытальні зваален у кучы на падлозе, апал адсутнічае. Калгасны клуб Раманавіцкага сельсовета (Гомельскі раён) у мінулым лічыўся амаль адным з лепшых клубаў на Беларусі, з'яўляўся цэнтрам культурна-масавай работы, палітычнай агітацыі і прапаганды, а ў сучасны момант ён на замку, ніякай работы не праводзіцца. У Забраўскім сельсавеце (гэтага-ж раёна) хата-чытальня культурнага абслугоўвання калгаснікаў не арганізавала, затое на тэрыторыі сельсовета актыўна арудуюць царкоўнікі, сектанты.

Дарэчы, там, дзе дрэнна наладжана палітыка-асветная работа, дзе масы прадастаўлены самім сабе, там ёсць поле дзейнасці для царкоўнікаў, сектантаў. У Мар'янскім сельсавеце (Добрушскага раёна) царкоўнікі на чале з папом Багданам служылі паніхіду па ворагах народа, тройчы праклятай бандзе агентаў Гестапо, прыгавораных Вярхоўным судом да расстрэлу. Ксяндзы з Віцебска пасылалі сваіх «хадакоў» у м. Калышкі збіраць подпісы на адкрыццё касцёла. Яўрэйскія клерыкалы ў м. Лёзне вядуць агітацыю за абразанне дзяцей, спасылаючыся, што «па новай Канстытуцыі дазволена ўсё рабіць».

Гэта зусім не выпадкова. Нашы агульныя поспехі паралізілі ў многіх нашых партыйных, совецкіх і грамадскіх работнікаў галавакружэнне. Стварылася нетарэчнае ўяўленне, што нібыта антырэлігійная прапаганда з'яўляецца пройдзеным ужо этапам.

Контррэвалюцыйная дзейнасць папоў, ксяндзоў і сектанцкіх прапаведнікаў кожны год узмацняецца перад рэлігійнымі святамі, асабліва перад калядамі. У дні калядаў царкоўнікі забіваюць галовы працоўных дэкунскімі казкамі аб нараджэнні божага сына, яны падносяць працоўным чарговую порцыю рэлігійнага дурману. У быту працоўных рэлігійнікі імкнуцца падтрымаць стары быт з яго перажыткамі праклятага мінулага.

Палітычна-асветныя ўстановы, на абавязак якіх ускладаецца ганарозая задача па культурнаму абслугоўванню працоўных мас, далёка яшчэ не выконваюць гэтай задачы. Райкомы партыі, райвыканкомы, аддзелы народнай асветы на справе з'яўляюцца пабочнымі назіральнікамі бяздзейства палітыка-асветных устаноў і не займаюцца пытаннямі разгортвання палітычна-асветнай работы. А ў радзе месц злачынна зрываюць іх работу.

Сакратар Будакашалёўскага РК КП(б)Б тав. Пячонка прама прызнаецца, што райком справаю палітасветнай работы не займаўся. На працягу апошняга года бюро ніколі не разглядала пытання аб рабоце палітасветных устаноў. Райком не знайшоў часу, каб склікаць нараду загалчыкаў хат-чытальняў. Ігнараванне райкомам партыі гэтай важнейшай работы — цяжкая з'ява.

Вось старшыня Бярэзінскага РВК Шалапёнак палітасветнай работай займаецца фармальна. Большасць хат-чытальняў знаходзіцца на замку. Бібліятэкі пры чытальнях запруджаны шкоднай літаратурай. У раённым цэнтры бібліятэка ДСК закрыта. Книжны фонд у 6 тыс. томаў скінуты ў кучу і псуецца. Ні райкома партыі, ні РВК гэта не турбуе.

І пальцам не варухнула, каб наладзіць работу ДСК і хат-чытальняў і ліквідаваць шкодніцтва ў галіне палітасветработы новае кіраўніцтва Наркамасветы. Яшчэ галтэуль нарком тав. Піваваў не ўкамплектаваў аддзел палітасветработы надзейнымі кадрамі. Усе скаргі палітасветработнікаў, якія ідуць на імя наркома, накіроўваюцца работніку аддзела палітасветработы Казунову без вынікаў, без адпаведнага вырашэння. На працягу трох апошніх месяцаў нарком «не мог» знайсці часу, каб правесці вытворчую нараду з работнікамі гэтага аддзела наркамата, каб намеціць план практычнай работы. Не прымае ніякіх мер новае кіраўніцтва ў адносінах ліквідацыі вынікаў шкодніцтва ў галіне падрыхтоўкі кадраў палітасветработнікаў (адзіны інстытут і той закрыт), у галіне будаўніцтва культасветустаноў. У Слуцку, напрыклад, ужо другі год «будуецца» дом соцкультуры. За апошнія некалькі год ні адной планавай хаты-чытальні не пабудована.

Кіраўніцтву Наркамасветы трэба неадкладна ліквідаваць вынікі шкодніцтва на фронце культурна-асветнай работы і забяспечыць бесперабойную работу палітычна-асветных устаноў.

П. СТАРАВЫБАРНЫ.

К. КІСЯЛЁЎ

Народны камісар аховы здароўя БССР

ЛІКВІДАВАЦЬ ВЫНІКІ ШКОДНІЦТВА Ў АХОВЕ ЗДАРОЎЯ

Велізарнымі сусветна-гістарычнымі перамогамі ва ўсіх галінах социялістычнага будаўніцтва сустрэлі народы СССР новы 1938 год.

Вялікая Кастрычніцкая рэволюцыя, якая вызваліла народы Совецкай Беларусі ад жахаў капіталістычнай эксплаатацыі, ад беспрацоўя і галечы, ад голаду, выраджэння і вымірання, адкрыла і перад совецкай медыцынай найшырэйшыя магчымасці росквіту і новых дасягненняў.

У дарэволюцыйны час мерапрыемствы па ахове здароўя насельніцтва на тэрыторыі, займаемай БССР, фактычна адсутнічалі. Царскі ўрад свядома праводзіў палітыку, якая асуджала шырокія працоўныя масы на голад, галечу і выміранне. Капіталісты, памешчыкі, кулакі і іншыя паразіты нажываліся за лік рабочых і сялян, зусім не думалі і ніколькі не клапаціліся аб іх здароўі. Лячэбныя ўстановы, асабліва на вёсцы, налічваліся адзінкамі. З-за адсутнасці медыцынскай дапамогі штогод паміралі дзесяткі тысяч працоўных. Асабліва лютавалі тады эпідэміі тыфа, малярыі, дыфтэрыі і інш. Неймаверна пяжкія ўмовы працы, надзвычай дрэнныя жыллёва-бытавыя ўмовы, поўгалоднае існаванне, невуцтва і цемра з'яўляліся спрыяючай глебай для распаўсюджвання розных социяльных хвароб.

У рэзультаце сталінскіх клопатаў аб чалавеку, пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі за годы Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі ў БССР праведена гіганцкая работа па ахове здароўя працоўных.

З года ў год раслі асігнаванні на ахову здароўя. У 1937 годзе гэтыя асігнаванні складаюць суму ў 218 мільёнаў рублёў. У 1914 годзе на тэрыторыі, цяпер займаемай БССР, на ахову здароўя было затрачана толькі 700 тысяч рублёў.

На 1938 год асігнаванні на ахову здароўя ў БССР павялічваюцца на 25 мільёнаў рублёў.

У 1914 годзе ў больніцах было ўсяго 2.900 коек, а ў 1937 годзе мы маем 15.960; больш чым у пяць разоў павялічыўся коечны фонд. Нашы больніцы тэхнічна і медыцынска значна лепш абсталяваны і па якасці непараўнальна вышэй, чым больніцы дарэволюцыйнага часу. У 1914 годзе ў Беларусі толькі 3,5 проц. рожаніц былі ахоплены медыцынскай дапамогай. У 1937 годзе ахоп рожаніц медыцынскай дапамогай дасягае 80 проц. Многія віды медыцынскай дапамогі зусім адсутнічалі ў дарэволюцыйны час: не было дыспансераў, дапамогі на даму, кансультацый, ясляў і іншых медыцынскіх устаноў. У мінулым працоўныя Беларусі таксама не ведалі курортна-санаторнай дапамогі, арганізаванага адпачынку — у выглядзе дамоў адпачынку, фізкультуры і турызма.

Цяпер у БССР налічваецца 123 дзіцячыя і жаночыя кансультацыі. 233 сталых яслей у гарадах нашай рэспублікі ахапляюць каля 12.000 дзяцей. Сталымі і сезоннымі дзіцячымі яслямі на вёсны ахоплена 350.000 дзяцей.

У 1937 годзе налічвалася 300 калгасных радзільных дамоў і 134 кансультацыі па ахове маці і дзіцяці.

У выніку нераможнага социялістычнага будаўніцтва мы маем па БССР рэзкае зніжэнне захворваемасці і смяротнасці як агульнай, так і дзіцячай.

У 1910 годзе агульная смяротнасць насельніцтва на 1.000 была 21,1, у 1935 годзе яна складала 12,5, г. зн. агульная смяротнасць знізілася амаль у два разы.

Дзіцячая смяротнасць у 1910 годзе складала на 100 нарадзіўшыхся 19,5, а ў 1935 годзе — 8,5, г. зн. знізілася больш чым у два разы. Значна зменшылася, напрыклад, захворваемасць па сіфілісу — больш чым у 26 разоў у параўнанні з 1914 годам.

Па БССР мы таксама маем вялікае зніжэнне па туберкулёзу, трахоме і іншых хваробах.

Захворванні зваротным тыфам, воспай зусім ліквідаваны.

Вядома, што ў Беларусі ў дарэволюцыйны час воспа, халера, брушны тыф уносілі велізарную колькасць афяр.

***

Гэтыя поспехі ў галіне аховы здароўя ў БССР дасягнуты пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна ў жорсткай класавай барацьбе, у бязлітаснай барацьбе з контрэволюцыйнымі бандытамі — троцкістамі, зіноўеўцамі, бухарынцамі, нацыянал-фашыстамі — гэтымі наймітамі фашысцкіх разведак, шпіёнамі і дыверсантамі, якія стараліся падарваць наша социялістычнае будаўніцтва. Нашы поспехі былі-б яшчэ большымі, калі-б работнікі аховы здароўя былі больш пільнымі і сумелі-б своечасова выкрыць подлых агентаў фашызма, доўгі час школзіўшых, а зрэдзь і зараз школзячых на асобных участках работы.

Ворагі народа, засеўшыя ў НК аховы здароўя БССР, перш за ўсё імкнуліся паслабіць фронт барацьбы з эпідэміямі, зыклікаць успышкі тых ці іншых хвароб.

Амаль усё будаўніцтва санітарных устаноў, закліканых змагацца з эпідэміямі, намечанае на другую пяцігодку, было затарможана ворагамі народа.

Школнікі ліквідавалі санітарны факультэт пры Мединстытуце, які павінен быў рыхтаваць урачоў, неабходных для санітарнага аздараўлення краіны. Зараз гэты факультэт зноў адкрыт.

Як вынік шкодніцтва, наглядаецца ў нас таксама нелахон санітарных урачоў. З патрэбных 113 санітарных урачоў ёсць толькі 58 чалавек. За апошнія тры гады наша рэспубліка не атрымала ні аднаго новага санітарнага ўрача.

Ворагі народа з сістэмы НК аховы здароўя не вялі планамернай і сістэматычнай барацьбы з эпідэмічнымі захворваннямі. Яны злачынна зрывалі гэту важнейшую работу. Былі выпадкі, калі школнікі праз медыцынскія ўстановы злачынна распаўсюджвалі інфекцыйныя хваробы.

***

Клопаты аб маці і дзіцяці магчымы толькі ў краіне, дзе ўлада знаходзіцца ў руках рабочага класа, дзе партыя і ўрад праяўляюць выключную ўвагу да самага каштоўнага капітала — чалавека, дзе маці і дзіця знаходзяцца пад асаблівай аховай социялістычнай дзяржавы.

Ворагі народа імкнуліся ўсімі мерамі затрымаць тэмпы будаўніцтва медыцынскіх устаноў. Гэтыя гнусныя шпіёны — агенты аховранак—закансервавалі 21 аб'ект —радзільныя дамы, яслі, малочныя кухні.

Сталінскія аб'екты будаўніцтва — радзільныя дамы—будаваліся з такім разлікам, каб дыскрэдытаваць у вачах насельніцтва гэта зажнейшае мерапрыемства партыі і ўрада. Будаваліся тыпавыя радзільныя дамы на 4, 7 і 15 коек у тых месцах, дзе ўжо існавалі радзільныя аддзяленні.

Так, у Смалявічах, Заслаўлі, Бабруйску і іншых месцах новыя радзільныя дамы былі пабудаваны ў некалькіх метрах ад існуючых.

Каб затармазіць будоўлі, будаўнічыя матэрыялы разбазаваліся, перакідваліся на іншыя аб'екты.

Многія калгасныя радзільныя дамы працуюць дрэнна, не заваявалі дастатковага аўтарытэта сярод насельніцтва, і ў выніку пустуюць.

У Рагачоўскім раёне ў памяшканні забалоцкага калгаснага радзільнага дома доўгі час ссыпалі торф і патрабавалася шмат намаганняў, каб аслабаніць памяшканне.

Рад консультацый аховы маціры і дзіцяці ў сельскіх мясцовасцях працуе нездавальняюча, дрэнна абслугоўвае жанчын і дзяцей і выклікае законнае незадаволенне пацыентаў.

НК аховы здароўя БССР пакуль-што яшчэ дрэнна кіруе гэтай работай. Патрэбны самыя рашучыя меры, каб ліквідаваць вынікі шкодніцтва на ўчастку аховы маціры і дзіцяці.

***

Нямала нашкодзілі ворагі і ў галіне размеркавання медыцынскіх кадраў. Яны свядома перанасычалі ўрачэбным персаналам гарады і агаллі ўрачэбныя ўчасткі на вёсцы.

З ліку зыпушчаных у 1937 годзе 540 урачоў у раёнах працуюць усяго толькі 60 чал., а на ўрачэбных абмулаторных участках — 6 чал. Астатнія ўсе аселі ў гарадах.

Аб павышэнні кваліфікацыі сельскіх урачоў не клапаціліся. Загадчыкі райаддзелаў аховы здароўя ніколі не склікаліся на спецыяльныя курсы.

Райвыканкомы і райаддзелы аховы здароўя і зараз недастаткова клапоцяцца аб паляпшэнні бытавых умоў урачоў на сяле. Так, у Багушэўскім раёне ёсць усяго 4 урачы, прычым двум з іх дагэтуль не прадастаўлены кватэры. Не прадастаўляюць урачам кватэр і ў Чавускім і Добрушскім раёнах. У Оршы з-за адсутнасці кватэр урачы жывуць у гасцініцы.

З гэтымі агіднасцямі трэба пакончыць!

Ворагі, якія доўгі час сядзелі ў кіраўніцтве НК аховы здароўя БССР, выкрыты і абезшкоджаны.

Ці можна сказаць, што вынікі шкодніцтва зусім ліквідаваны, што на фронце аховы здароўя усё абстаіць добра? Зразумела, не.

Зараз наша рашаючая задача ў галіне аховы здароўя — ліквідаваць вынікі шкодніцтва подлых ворагаў народа, ачысціць апарат органаў аховы здароўя ад ўсіх варожых, неправераных і палітычна ненадзейных людзей.

Ажыццяўленне гэтай задачы патрабуе ад усіх медыцынскіх работнікаў Беларусі рашучага павышэння класавай пільнасці, вывучэння людзей, перабудовы ўсёй сваёй работы па-новаму.

Трэба навесці большэвіцкі парадак у лячэбных установах БССР, акружыць хворага клопатамі і ўвагай.

Асабліва важная задача—поўная ліквідацыя эпідэмій. Адзіным фронтам усе ўстановы аховы здароўя і медыцынскія работнікі БССР разам з совецкай грамадскасцю абавязаны рэзка палепшыць санітарна-эпідэмічнае становішча гаралоў і вёсак нашай рэспублікі. У цэнтры ўвагі павінны таксама стаяць пытанні пашырэння і паляпшэння лячэбнай дапамогі на сяле і ў пагранічных раёнах.

Партыйныя і непартыйныя большэвікі—медыцынскія работнікі БССР — пад кіраўніцтвам партыі даб'юцца новых рашаючых поспехаў на фронце аховы здароўя.

ШКОДНІКІ Ў ЛЕСГАСЕ

Не так даўно быў сур'ёзныя сігналы аб шкодніцтве ў Суражскім лесгасе. Галоўнымі асобамі Фігуравалі Руцько, Кулакоўскі і інш.

Што-ж пасля гэтага робіць дырэктар лесгаса Чэпік? Замест ачышчэння лесгаса ад варожых элементаў, ён сам уключыўся ў гэту кампанію і ўсёй сваёй працай развальвае лесгас.

Усе жулікі, прахалаімцы і асобы, якія не ўнушаюць палітычнага давер'я (Жугер, Кулакоўскі і інш.), засталіся на месцы і карыстаюцца заступніцтвам дырэктара, па-ранейшаму шкодзяць. Больш таго, гора-дырэктар прыцягвае на работу ў лесгас цэлую групу людзей, частка якіх аказалася ворагамі.

Знятага з пасады дырэктара Віцебскага лесгаса ён ставіць памочнікам ляснічага, ён аказаўся ворагам народа. Выключнага з партыі былога сакратара Суражскага райкома комсамола Гульмана Чэпік прызначыў начальнікам аховы лясоў. Работу ён развальвае. Некалькі месяцаў ён зусім не працаваў, а грошы атрымліваў. Аб'езчыкам Янавуцкай дачы прызначыў нейкага Шарпава, неправеранага чалавека. Лесніком паставіў Куржакова І., па наяўных вестках, былога кулака. Планавіком прыняў на працу бядзейніка Немчанку.

Гэта няпоўны пералік людзей, якіх Чэпік за кароткі час сабраў у лесгас, а лепшых работнікаў, працаваўшых на працягу некалькіх год, ён праганяе з сістэмы лесгаса.

Чэпік не толькі захоўвае і падбірае «свае» кадры, ён-жа і парушае рэзолюцыйную законнасць. У жніўні мінулага года распіразаны дырэктар у грамадзянна вёскі Стайкі, Марчонскага сельсовета, Анісімава А. зрабіў вобыск.

Чэпік работай не кіруе. У кантору прыходзіць рэдка, а калі і прыходзіць, то толькі вечарам, запіраецца ў сваім кабінеце з работніцамі і вядзе палюбоўныя гутаркі. Узесь астатні час ён са сваімі паплечнікамі займаецца толькі п'янкай. Таму і няма чаго здзіўляцца, што дысцыпліна сярод работнікаў адсутнічае, на працу прыходзяць у 10—12 гадзін, 2 гадзіны займаюцца рознымі плёткамі.

У лесгасе ёсць свае дамы, але-ж Чэпік іх здае ў арэнду прыватнікам і сам займае дзве кватэры, а рабочыя і інжынерна-тэхнічныя работнікі лесгаса жывуць у наёмных кватэрах, плоцяць вялікія сумы дзяржаўных грошай.

Паступаючыя заявы ад рабочых у мясцком яго старшыня Касёнак перадае на разгляд дырэктару, ён выклікае ў кабінет машыністку і там фабрыкуе «пастановы РКК»: «прышлі да згоды, дзеянні дырэктара правільныя».

Уся работа Чэпіка і яго кампаніі накіравана на зрыў плана лясной гаспаладкі, на дэзарганізацыю працоўнай дысцыпліны, паслабленне лесааховы. З-за злачынстваў недарубы дасягаюць больш 30.000 кубаметраў лесаматэрыялу. Многа знішчана ад пажару лесу. Дзесяць га плошчы для пасеву лесу было падрыхтавана пашкодніцку.

На змешчаны ў раённай газеце допіс аб групе шкоднікаў, арудуючых у лесгасе, ніхто не рэагаваў. Райком партыі нават не зацікавіўся становішчам лесгаса і яго кадрамі.

РАБОЧЫ.

ВАРОЖАЯ РУКА АРУДУЕ Ў КАЛГАСЕ „ЧЫРВОНЫ АРАТЫ"

У нашым калгасе «Чырвоны араты», Галіцкага сельсовета, Клімавіцкага рэёна, яшчэ да апошняга часу калгаснікі нічога не атрымалі на працадні.

Усё калгаснае дабро ў нас раскрадаецца, збожжа яшчэ дагэтуль не абмалочана. Хлеб вельмі дрэнна захоўваецца і ўвесь згніў.

Усё гэта атрымалася таму, што наш старшыня калгаса, Кавалькоў В. Д., зусім не цікавіцца калгаснымі справамі. Ён усю работу прадаставіў самацёку.

Сам Кавалькоў у свой час дэзертыраваў з Чырвонай Арміі, доўгі час займаўся спекуляцыяй, за што быў арыштован хоцімскай раённай міліцыяй. Уступіўшы ў калгас, ён адразу-ж заняўся раскраданнем калгаснага дабра і продажам яго на рынку, за што быў яшчэ раз арыштован клімавіцкай раённай міліцыяй.

У 1936 годзе гэты шкоднік пралез на пасаду старшыні нашага калгаса і ўвесь час вялзе сваю шкодніцкую работу. Аб яго агідной дзейнасці калгаснікі пісалі ў раённую газету «Комуна», але рэдакцыя матэрыял пераслала ў МТС, дзе спрэву паклалі пад сукно.

Кавалькоў цесна звязан з старшынёй сельсовета Манетавым і з некаторымі іншымі асобамі, якія дапамагаюць яму замятаць сляды шкодніцкай дзейнасці.

У свой час гэты самы Кавалькоў працаваў разам з контрэволюцыйнай эсэраўскай групай. Частку з гэтых людзей выкрылі, а частку з іх старшыня сельсовета Манетаў скрыў. Напрыклад: брата Кавалькова І. Д., які зараз працуе на пошце ў Клімавіцкім раёне. У 1935 г. гэты самы Кавалькоў І. Д. страляў з нагана ў калгаснікаў.

Вось чаму ў нашым калгасе дрэнна пастаўлена праца і нашы калгаснікі зусім мала атрымліваюць на свае прапалні.

ЦІТКОЎ.

АБ КУЛЬТУРНАЙ РАБОЦЕ Ў ІНТЭРНАТАХ

У інтэрнаце Белкомунбуда на Кальварыі (гор. Менск) знаходзіцца больш 300 чалавек рабочых. Дырэкцыя і пабудком умовамі жыцця рабочых не цікавяцца. Старшыня пабудкома № 62 тав. Хромаў наогул рэдкі госць у інтэрнаце.

Сталоўкі пры інтэрнаце няма. На працягу чатырох месяцаў загадчык інтэрнатаў Белкомунбуда Рагатка абяцае рабочым арганізаваць сталоўку, але гэта застаецца толькі абяцаннем. У інтэрнаце Рагатка не дазваляе варыць гарачыя абеды, і рабочыя вымушаны есці сухую страву.

Не лепш арганізавана і культурнае абслугоўванне рабочых. Ёсць у інтэрнаце ленкуток і бібліятэка, але рабочыя ў вольны час паэбаўлены магчымасці пачытаць кніжку, бо загадчык ленкутка Шэлег на просьбу рабочых аб выдачы ім кніжак адказвае:

— Я не платны работнік, і літаратуры вам не дам.

Ленкуток скарыстоўваецца выключна для танцаў, якія канчаюцца заўсёды бойкамі.

СОКАЛ, ДУБІНА.

АД РЭДАКЦЫІ.

У апошні час у рэдакцыю паступае рад сігналаў ад рабочых, што ў інтэрнатах цагельнага завода № 3. Белкомунбудтрэста і фурнітурнага завода пытанням культурнага абслугоўвання рабочых інтэрнатаў ніхто не займаецца. Людзі прадастаўлены самім сабе. Важнейшыя рашэнні партыі і ўрада з імі не вывучаюцца.

Рэдакцыя звяртае ўвагу райкомаў партыі горада Менска і ЦП саюзаў на тое, што гэты важнейшы ўчастак работы заставецца да гэтага часу без увагі партыйных і прафесіянальных арганізацый.

Больш 200 розных гурткоў працуюць пры Палацы піанераў і акцябрат у Менску: фізкультурныя, мастацкія, тэхнічныя, драматычныя, фото, рукадзельныя і т. д. Усяго ў гэтых гуртках займаецца 4.300 дзяцей. **На здымку:** рукадзельны гурток за работай. Кіраўнік гуртка тав. Васілеўская. **Фото Я. Салавейчыка.**

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

АГУЛЬНААДУКАЦЫЙНЫЯ ШКОЛЫ КОМУНІСТАЎ

Сталінскім горрайкомам партыі (г. Менск) арганізавана раённая агульнаадукацыйная школа комуністаў. Заняткі пачаліся 1 кастрычніка 1937 года.

У навучальны план школы ўключана — вывучанне рускай мовы, матэматыкі, прыродазнаўства, геаграфіі, гісторыі СССР і бягучай палітыкі. Слухачы атрымаюць адукацыю ў аб'ёме пачатковай школы.

Школа складаецца з 4 класаў, у ёй навучаецца 121 чалавек. Сярод іх многа стаханаўцаў, старых рабочых, як-та: тав. Ступін — вытворчы стаж 33 годы, кандыдат партыі з станкабудаўнічага завода імя Кірава; тав. Бекіш, член партыі, стаханавец скуразода «Большэвік»; тав. Кугель — работніца кандзіцерскай фэбрыкі «Комунарка», з вытворчым стажам больш 20 год, з'яўляецца дэпутатам Менскага горсовета, і рад іншых. Слухачы спалучаюць ударную стаханаўскую работу на вытворчасці з паспяховым навучаннем у школе.

Для слухачоў арганізован рад мерапрыемстваў, якія садзейнічаюць агульнаму, палітычнаму і культурнаму росту. Таварышы глядзелі выдатны кінофільм «Ленін у Кастрычніку», які суправаджаўся дакладам з глыбокім растлумачэннем гэтага перыяда гісторыі большэвіцкай партыі. Арганізавалі таксама экскурсію на выстаўку матэрыялаў і дакументаў, прысвечаных жыццю і дзейнасці дэпутата ў Совет Саюза Вярхоўнага Совета СССР ад Менскай гарадской выбарчай акругі Клімента Ефрэмавіча Варашылава.

Школа ўкамплектавана кваліфікаванымі выкладчыкамі, якія маюць педагагічны вопыт работы. Слухачы забяспечаны літаратурай; таварышы, якія жывуць на акраіне, атрымліваюць білеты для праезду на трамваі. Былі арганізаваны два канцэрты.

Аднак, асобныя пярвічныя партыйныя арганізацыі — заводаў «Большэвік» і імя Варашылава — недаацэньваюць вялікае значэнне гэтай школы. Гэтыя парткомы не забяспечылі ахопам вучобай усіх малапісьменных комуністаў, не арганізавалі акуратнага наведвання заняткаў слухачамі.

Зараз у школе праходзіць падзядзенне вынікаў вучобы за першы квартал. Слухачы прад'яўляюць зусім правільныя патрабаванні да райкома партыі, аб неабходнасці рэарганізацыі школы да аб'ёму сярэдняй навучальнай установы.

КУРСЫ АГІТАТАРАЎ

МЕНСК. 7 студзеня распачаліся заняткі дзесяцідзённых курсаў агітатараў, актывістаў выбарчай кампаніі, якія праводзяцца Варашылаўскім горрайкомам партыі. На іх прысутнічае 30 чалавек агітатараў, сярод іх 12 комсамольцаў.

Слухачам будуць прачытаны лекцыі па наступных тэмах: СССР — краіна перамогшага социялізма; партыя Леніна—Сталіна — арганізатар і кіраўнік перамог социялізма ў СССР; вынікі выбараў у Вярхоўны Совет СССР і бліжэйшыя задачы агітацыі; капіталістычны свет на парозе 1938 года; пытанні міжнароднага становішча; прыёмы і метады шпіёнска-дыверсійнай дзейнасці замежных разведчых органаў; задачы антырэлігійнай прапаганды і карта свету.

Курсы забяспечаны кваліфікаванымі выкладчыкамі, неабходнымі дапручнікамі і дапаможнай літаратурай. Пасля сканчэння гэтых курсаў пачнуцца заняткі другой чаргі, разлічаныя таксама на 30 агітатараў.

ДАПАМАГАЮЦЬ КАЛГАСАМ РЫХТАВАЦЦА ДА СЯЎБЫ

ЗАСЛАЎЛЬ. Па рашэнню райкома партыі, з 1 па 4 студзеня ва ўсіх сельсоветах раёна праведзены нарады нізавых агітатараў, актывістаў выбарчай кампаніі.

Для правядзення нарад райком мабілізаваў 15 таварышаў з раённага партыйнага актыва. У сельсоветах працуе 108 нізавых агітатараў, якія дапамагаюць калгасам рыхтавацца да сяўбы. Зараз гурткі, побач з палітычнымі тэмамі, прыступілі да глыбокага вывучэння статута сельскагаспадарчай арцелі, які прыняты на I з'ездзе калгаснікаў-ударнікаў.

У калгасных брыгадах праведзены агітатарамі гутаркі па пытаннях разгортвання социялістычнага спаборніцтва на дастойную сустрэчу большэвіцкай вясны.

Райком распрацаваў план правядзення 10-дзённых курсаў нізавых агітатараў з разлікам на 25 чалавек. Заняткі курсаў разлічаны на студзень месяц. Таксама будуць арганізаваны курсы совецкага актыва.

КАРАТКЕВІЧ.

ЗАМАЦАВАЦЬ ПАЛІТРАБОТУ У МАСАХ

Выбары ў Вярхоўны Совет СССР прайшлі ў Мазырскай пагранічнай акрузе з велізарным палітычным уздымам працоўных. Выбарчая кампанія з усёй сілай паказала вялікае значэнне палітычнай агітацыі сярод калгаснікаў, рабочых і совецкай інтэлігенцыі.

Партыйная арганізацыя нашай акругі прарабіла велізарную палітычную работу. У дні выбараў мы дабіліся стварэння моцнага калектыва агітатараў, аб'яднаўшага партыйных і непартыйных большэвікоў, якія неслі праўдзівыя словы нашай партыі ў масы працоўных.

Калі ў партыйнай арганізацыі акругі налічвалася толькі 1.210 агітатараў, то ў дні падрыхтоўкі да выбараў армія агітатараў значна павялічылася. На выбарчых участках актыўна працавалі 3082 агітатары. Сярод іх было: членаў партыі 814, комсамольцаў 1122, беспартыйных 1107, з іх жанчын — 401.

Пасля выбараў, каб замацаваць дасягнутыя поспехі ў разгортванні палітычнай агітацыі, мы замацавалі нашых агітатараў на ўчастак для работы з насельніцтвам. Ва ўсіх раёнах праводзяцца спецыяльныя нарады агітатараў, таварыскіх асоб, членаў участковых камісій.

Пленум акруговага камітэта партыі ў сваім рашэнні 3—4 студзеня прапанаваў усім раённым камітэтам, як сістэму штодзённай работы ў масах, правесці ва ўсіх калгасах, соўгасах, прадпрыемствах, установах спецыяльныя палітдні. Практыкаваць у гуртках разгорнутыя гутаркі, выкарыстоўваючы матэрыялы газет і мастацкай літаратуры, каб зрабіць палітычную агітацыю больш дахоллівай.

Зараз у кожным калгасе, вёсцы, хутары агітатары знаёмяць працоўных з пытаннямі міжнароднага становішча, рашэннямі нашай партыі і ўрада, з бліскучымі перамогамі сталінскага блока комуністаў і беспартыйных на выбарах, глыбока вывучаюць прамову таварыша Сталіна на перадвыбарчым сходзе Сталінскай выбарчай акругі гор. Масквы.

З першых дзён пасля выбараў райкомы пачалі вылучаць на кіруючую работу актывістаў выбарчай кампаніі — партыйных і непартыйных большэвікоў, вартых сыноў нашай радзімы. Ужо вылучана на розныя кіруючыя работы 28 членаў і кандыдатаў партыі, комсамольцаў 31 і беспартыйных 15 чал.

Даверанная асоба выбарчага ўчастка Петрыкоўскага раёна комсамолец Ліхачоў вылучан загадчыкам райана, комсамолец Зарэцкі — сакратаром рэдакцыі раённай газеты. Члены выбарчых камісій Глушко, член партыі, Казак (беспартыйны), Барысенка (комсамолец) выбраны старшынямі сельскіх советаў.

Радавы калгаснік, комсамолец Шпак адналушна зыбран старшынёй калгаса. Старшыня ўчасковай выбарчай камісіі кандыдат партыі Федаранка вылучан загадчыкам райземаддзела. Вылучаны таксама кандыдат партыі Валей — загадчыкам райаддзела аховы здароўя, член партыі тав. Лукашэнка — інструктарам райкома партыі, член партыі тав. Сімановіч — кіраўніком канторы «Заготзярно».

За час выбараў партыйныя арганізацыі прынялі ў кандыдаты партыі 10 чалавек, пераведзена з кандыдатаў у члены 6 чал. Гэтыя нязначныя лічбы сведчаць аб недаацэнцы рашэння ЦК ВКП(б) па аднаўленню прыёму ў партыю райкомамі партыі і акруговамі.

Пленум акруговага камітэта партыі ў сваіх рашэннях прапанаваў праводзіць спецыяльны партыйны дзень у нізавых арганізацыях з пытаннем росту партыі за лік лепшых людзей.

Партыйная арганізацыя акругі замацоўвае багаты вопыт арганізацыйна-прапагандысцкай работы, захоўвае залаты фонд зырасшых агітатараў, уцягваючы новыя кадры партыйных і непартыйных большэвікоў у работу па разгортванню палітычнай агітацыі сярод працоўных.

МАРКІН.

Сакратар Мазырскага акругкома партыі.

АЗДАРАВІЦЬ КІРАЎНІЦТВА ТОРФЗАВОДА

На працягу некалькіх год на торфаводзе «Дукоры» арудуе група жулікаў і прайдзісветаў, якія раскрадаюць дзяржаўную маемасць і творяць свае гнусныя справы.

Былы дырэктар Дворкін, механік Хадзюня, загадчык аддзела кадраў Адашчык, загадчык сталовай Бахір забралі для сваіх асабістых мэт заводскае сена, а потым прадазалі яго заводу па 10 рублёў за пуд. Імі-ж украдзена 70 пудоў саломы.

Адашчык і Хадзюня ператварылі прыгаральную гаспадарку ОРС'а ў свой асабісты склад, адкуль яны бралі ўсе прадукты без вагі, без грошай.

Пад выглядам службовых камандыровак на завод «Асінторф» Хадзюня ездзіў на спатканні да ворага народа ў Маскву. Адтуль ён заязджаў на «Асінторф» для адзнакі камандыроўкі.

Каб сарваць рамонт абсталявання, гэты механік звядома заказваў непатрэбныя часткі для машын каштоўнасцю ў 10—12 тысяч рублёў. Зараз яны заляжаць на складзе. Ён-жа сарваў рамонт лакамабіляў і новых торфагарнітур. Хадзюня сістэматычна аблічваў рабочых механічнага цэха, зніжаў ім расцэнкі. Прысланы на завод пас для малога гідраторфу ён парэзаў і прадаў калгасу «16 партызан». Грошы ўзяў сабе.

Былы старшыня тарфкома Бахір яўны прахадзімец, некалькі разоў выключаўся з комсамола і ашуканчым шляхам зноў пралез у рады ЛКСМ, сістэматычна раскрадаў профсаюзныя грошы і выдазаў сваім сябрам грошовыя дапамогі на наладжванне п'янак і куцяжоў.

Працуючы на новай пасадзе, у якасці загадчыка сталовай, ён увесь час пазышае цэны на блюды, растрацічу дзяржаўныя грошы.

Уся гэта кампанія прымала актыўны ўдзел у дапамозе былому старшыні Дукорскага сельсовета Левіну ў незаконным забранні маемасці і спагнанні штрафаў з аднаасобнікаў і калгаснікаў вёскі Турэц і інш.

Адашчык свядома зербаваў людзей на завод непрацездольных для таго, каб сарваць выкананне торфаздабычы.

Усе гэтыя людзі былі цесна звязаны з заклятымі ворагамі народа, узесь час трымалі з імі сувязь.

Дворкін нядаўна выключан з партыі і знят з пасады дырэктара. Усе-ж астатнія людзі да гэтага часу працягваюць свае брудныя справы на заводзе.

Зусім незразумела, чаму дагэтуль марынуецца справа аб злачынствах гэтай групы ў смілавіцкай пракуратуры.

Нядаўна Наркаммясцпром прызначыў дырэктарам торфазавода Каханавера, знятага з пасады старшыні плешчаніцкага РВК за сувязь з ворагамі народа.

Новы дырэктар адразу-ж пачаў уводзіць свае «парадкі».

На працягу месяца ён не зыдаваў рабочым салому для матрацаў, і яны спалі на голых дошках. Грузчыкі торфу працуюць ноччу ў цемнаце, што пагражае няшчаснымі выпадкамі. Калі рабочыя звярнуліся да дырэктара з просьбаю, каб ён выдаў ім аванс, апошні іх груба аблаяў.

Вывазка торфу ідзе зусім марудна. На сёння вывезена толькі 3 тысячы тон, хаця ўсе ўмовы для выканання плана вывазкі ёсць.

Наркаммясцпром і Белторф павінны прыняць усе захады да аздараўлення кіраўніцтва торфазавода «Дукоры».

Ф. ПУГАЧОЎ.

СПАБОРНІЦТВА ДВУХ ГАРАДОЎ

6 студзеня пры Бабруйскім РК КП(б)Б адбылася нарада гаспадарнікаў, сакратароў парткомаў, парторгаў і старшынь фабзаўкомаў па пытанню разгортвання социялістычнага спаборніцтва на прадпрыемствах і промарцелях раёна.

На нарадзе былі заслуханы даклады аб ходзе соцспаборніцтва на дрэваапрацоўчым камбінаце, заводзе № 4, фабрыцы «Чырвоны харчавік», фанерным заводзе імя Кірава і радзе іншых.

Нарада намецілa рад канкрэтных мерапрыемстваў па разгортванню стаханаўскага руху і парашыла выклікаць на соцспаборніцтва рабочых гор. Гомеля на лепшае і датэрміновае выкананне плана 1938 года.

С. ЛЯСНЕЎСКІ.

ХТО КІРУЕ БЕЛКААПРОМСОВЕТАМ

Сістэма прамысловай кааперацыі займае ў рэспубліцы даволі значнае месца па выпуску тавараў шырокага спажывання. Арцелі Белкаапромсовета, якія яднаюць разам з сезоннымі промысламі да 50 тысяч чалавек, у мінулым годзе далі на 350 мільёнаў руб. прадукцыі. Не меншую ролю будзе адыгрываць промкааперацыя і ў бягучым годзе.

Ворагі народа, трацкісцка-бухарынскія шпіёны і дыверсанты, агенты фашысцкіх контрразведак, якія арудавалі доўгі час у БССР, не пакінулі без увагі і промкааперацыю. Ворагі народа прапаведвалі «тэорыю», што ў невялікіх арцелях шкоднікам няма чаго рабіць. Гэта контрэволюцыйная ўстаноўка была накіравана на тое, каб усыпляць рэволюцыйную пільнасць мас арцельшчыкаў і даць магчымасць фашысцкім агентам праводзіць сваю шкодніцка-дыверсійную работу.

За апошні час слаўнымі органамі НКВД выкрыта нямала подлых зорагаў народа ў сістэме промкааперацыі. Але вораг тут яшчэ канчаткова не дабіт. Ён прабуе замесці свае сляды, а на некаторых участках ён прадоўжвае актыўна шкодзіць.

Шкодніцтва ў сістэме Белкаапромсовета ішло па розных лініях. Мы мелі тут многа фактаў прамых дыверсій, вызалу са строю абсталявання, падпалы. Больш замаскавана ворагі дзейнічалі ў галіне падрыву вытворчай дзейнасці арцеляў.

У пачатку 1937 года Усесаапромсовет зацвердзіў галавы зытворчы план для Белкаапромсовета ў суме 325 мільёнаў 987 тысяч рублёў. СНК БССР, у якім у той час арудавалі ворагі народа, незаконна павялічыў гэты план да 338 мільёнаў 402 тысячы рублёў. Але кіраўнікі Белкаапромсовета і на гэта не згадзіліся. І з'явіўся вядомы «катаводаўскі» план, павялічаны на 25 мільёнаў рублёў у параўнанні з першым. У план былі ўнесены сякія-такія «карэктывы» яўна шкодніцкага парадку. Асабліва быў павялічан план тых галін, якія працуюць на дэфіцытнай сыравіне. Так, па скураной групе план быў павялічан на 13 мільёнаў рублёў. Па такіх-жа галінах, як будаўнічая кераміка, тарфяная прамысловасць, якія працуюць на мясцовай сыравіне, план быў зменшан на паўтара мільёна рублёў.

На першы погляд, у гэтым няма нічога антыдзяржаўнага, шкодніцкага. На справе-ж павелічэнне плана, прычым асабліва тых галін, якія працуюць на дэфіцытнай сыравіне, было згадзя абдуманым шкодніцкім крокам. Гэта рабілася для таго, каб сарваць выкананне вытворчай праграмы, сарваць план накаплення сродкаў. На практыцы атрымалася так, што маса арцеляў, не выканаўшы свайго плана, былі пазбаўлены абаротных сродкаў, не мелі магчымасці атрымаць прагрэсіўную аплату, пазбаўлены былі фондаў паляпшэння быту. Членам арцелі не выплачвалася па 2—3 месяцы зарплаты. І алсюль — масавае незадаволенне членаў арцелі.

«Катаводаўскі» план прывёў да таго, што многія арцелі аказаліся нерэнтабельнымі, і іх закрылі. Так было ліквідазана 140 арцеляў: 35 будаўніча-керамічных, 44 тарфяных, 39 па металаапрацоўцы, 17 уцільных і інш.

Ніякія пярэчанні нізавых работнікаў не дапамаглі. Але затое гэты план быў выгадны для самога Катаводава. Ён нажываў сабе аўтарытэт у ворагаў народа, якія ўзначальвалі Усесаапромсовет і кіруючыя органы БССР, і за «добрую» работу яны прэміравалі яго.

Для выканання сваіх шкодніцкіх дырэктыў Катаводаў у многіх саюзах мае сваіх людзей. Белметалпромсаюз узначальвае Бязносаў. Гэты чалавек быў цесна звязан з заклятымі ворагамі народа, контрэволюцыянерамі-трацкістамі, усяляк імі высоўваўся.

Белметалпромсаюз ён засмечваў класава-варожымі элементамі, трацкістамі і бундаўцамі. Былы старшыня віцебскай арцелі «Калектыўная праца» быў знят з работы за злоўжыванні. Яго прытуліў Бязносаў і назначыў старшынёй арцелі гадзіннікаў у Віцебску. Праз некаторы час ён быў выкрыт як вораг народа.

Буйнейшай арцеллю ў Магілеве — металкамбінатам — кіраваў доўгі час дэзертыр Чырвонай Арміі, былы сіяніст.

Снабжэнчы апарат Металпромсаюза засмечан прахадзімцамі, спекулянтамі. Бязносаў трымае сваіх агентаў на металургічных заводах Урала. Апошнія рознымі жульніцкімі махінацыямі засылаюць у арцелі непатрэбнае жалеза. Дзесяткі тысяч рублёў выкідваюцца на вецер. На металакамбінаце ў Магілеве ляжыць на 50 тысяч рублёў нягоднага жалеза.

Бязносаў з групай падхалімаў ездзіў на зытворчую экскурсію ў Ленінград, Горкі, Паўлава. Пасля прыезду ён пачаў ўводзіць «навіны», што прынесла арцелям велізарныя страты (бабруйскай арцелі—17 тысяч рублёў, менскай — 10 тысяч рублёў, магілеўскай — 40 тыс. руб.). Дарэчы, асвоеныя магілеўскім металакамбінатам складаныя ножыкі каштуюць сабе 130 рублёў штука.

Аб цёмных справах Белметалпромсаюза некалькі разоў пісала «Звязда» і іншыя рэспубліканскія газеты. У Белкаапромсовет таксама паступіла нямала сігналаў. І вось, тут парашылі абследаваць даны саюз. Была створана спецыяльная камісія, затрацілі на гэту справу 2.000 руб., а вывалы ляжаць у Белкаапромсовеце з 1 сакавіка 1937 года неразгледжанымі. Не ў інтарэсах-жа Катаводава выкрываць сваіх людзей.

Непрыстойныя справы творацца ў Уціль промсаюзе. Некалькі месяцаў таму назад «Звязда» змясціла пісьмо групы рабочых з калінкавіцкага уцільканбіната, у якім пісалася, што кіраўніцтва арцелі ў асобе старшыні робіць варожыя справы.

Старшыня Уцільпромсаюза Казлоўскі пасвойму рэагаваў на сігналы друку. Старшыню арцелі ён увёў у прэзідыум саюза і хадайнічаў перад Мазырскім акруткомам партыі аб вошпуску яго ў Менск. Праз некалькі дзён гэты старшыня арцелі быў выкрыт як вораг народа.

Тое-ж здарылася і з назначэннем намесніка старшыні менскай уцільарцелі, які скора быў зыкрыт як вораг. Ёсць дзесяткі сігналаў аб спекуляцыі на скупачных пунктах. Арцелі засмечаны класава-варожымі элементамі. Але Казлоўскі на гэта не рэагуе.

Бумкерамсаюз некалькі год узначальзаў вораг народа. Сляды яго «дзейнасці» досыць алчувальныя. 24 цагельныя і вапняныя заводы пабудаваны па-шкодніцку: на месцах балоцістых і там, дзе няма сыравіны.

Касцюковіцкі механізаваны цагельны завод абышоўся ўжо каля мільёна рублёў, а эфектыўнасць яго мізэрная. Ён павінен, па плану, даваць штогод па 6 мільёнаў штук цэглы. За прайшоўшыя-ж 5 год ён даў усяго 5 мільёнаў 300 тыс. штук, з якіх 2 мільёны штук аказаліся бракованымі. Зараз завод знаходзіцца ў поўразбураным становішчы.

Хто-ж узначальвае промкааперацыю рэспублікі?

На працягу раду год аддзелам кадраў Белкаапромсовета кіраваў масціты шпіён, толькі нядаўна выкрыты органамі НКВД. Дарэчы, гэты фашысцкі агент быў членам парткома і доўгі час замяняў сакратара парткома.

Начальнікам спецаддзела быў былы афіцэр царскай арміі Азаркезіч. Ён быў цесна звязан з ворагамі народа. Катаводаў доўга марынаваў кампраметуючыя матэрыялы аб Азаркевічу. Сам Катаводаў жыў у дружбе са шпіёнам. З 1932 па 1936 г. кіраваў Белкаалеспромсаюзам. У апараце яго працавалі ворагі народа—трацкісты і шпіёны, але Катаводаў іх «не заўважаў», пакуль органы НКВД іх не выкрылі.

На пасаду старшыні Белкаапромсовета Катаводаў быў вылучан польскімі шпіёнамі.

Гэта ён паднёс зорагу народа гарнітур мэблі на суму ў 10 тысяч рублёў за кошт Белкаапромсовета.

Напярэдадні Налаўзычайнага VIII Усесаюзнага з'езда Советаў Катаводаў склікае ў Менск 46 лепшых майстроў вышывання. Наладжвае вытворчы цэх у гасцініцы «Інтурыст». Вышывальшчыцам даецца заданне—вышыць шаўковыя кашулі, як быц цам для дэлегатаў з'езда. На ногі былі ўзняты ўсе работнікі Белкаапромсовета. На гэту запею было затрачана 23 тысячы рублёў. Кожная кашуля абышлася ў 500 рублёў. Іх паднесці... ворагам народа.

Катаводаў разам з Азаркевічам сфабрыкаваў пастанову прэзідыума, у якой затрачаныя сродкі адносяцца за кошт Белкаапромсовета.

З санкцыі Катаводава былы старшыня Белторфпромсаюза Слазін прэміруе цалую групу сакратароў райкомаў і старшынь райвыканкомаў за «выкананне» плана торфаздабычы па 500 рублёў кожнага. Грошы ўзяты з прэміяльнага фонда для стаханаўпаў. Не пакрыўдзіла сябе і кіраўніцтва Торфпромсаюза. Славіну выдалі буйную прэмію ў 2.000 руб. яго намесніку Пескіну — 1.500 рублёў, члену прэзідыума Шкору — 1000 руб.

Партэрганізацыя Белкаапромсовета аказалася на паваду ворагаў народа. Аб гэтым дастаткова гаворыць склад самога парткома. Адзін з членаў парткома нядаўна выкрыт як шпіён, другі—Марголін (нам. старшыні Белкаапромсовета) — стаўленік заяўлага ворага беларускага народа. Сам сакратар — Краўцоў — заўзяты падхалім Катаводава.

Нядаўна Катаводаў «прэміраваў» Краўцова пуцёўкай на курорт, месячным акладам і выдаў 800 рублёў на рамонт кватэры.

Пасля гэтага партком усе справы аб Катаводаву і іншых кіраўніках Белкаапромсовета замазваў і ўтойваў ад партыйнай арганізацыі.

Цяпер робіцца зусім ясным, чаму да гэтага часу партком не абмяркоўвае пытання аб ліквідацыі вынікаў шкодніцтва ў сістэме промкааперацыі, чаму да гэтага часу, не гледзячы на настаянні нізавых работнікаў, не склікаецца актыў, чаму стаханаўскі рух у загоне, чаму дагэтуль на чале Белкаапромсовета стаяць стаўленікі ворагаў народа, якія праводзяць на практыцы шкодніцкую палітыку, накіраваную на падрыў усёй работы промкааперацыі.

І. СМОЛЬСКІ.

ВАЕННЫЯ ДЗЕЯННІ Ў КІТАІ

У ЦЭНТРАЛЬНЫМ КІТАІ

ХАНЬКОУ, 7 студзеня. (БЕЛТА). У ваколіцах Ханчжоу і Фуяна адбываюцца невялікія сутычкі паміж кітайскімі і японскімі войскамі.

6 студзеня пяць кітайскіх самалётаў бамбардыравалі японскія ваенныя склады ў Цаясіне.

У сектары паўднёвага ўчастка Цяньцзінь-Пукоўскай чыгункі кітайскія войскі выбілі японцаў з Мінгуаня (за 60 кілометраў на паўночны захад ад Чучжоу).

У ПАЎНОЧНЫМ КІТАІ

ХАНЬКОУ, 7 студзеня. (БЕЛТА). У паўднёвай частцы правінцыі Хэбей кітайскія партызаны занялі Фэйсянь (на паўночны захад ад Даміна). Яны ўпарта прасоўваюцца да Хайданя, што на чыгунцы Бэйпін—Ханькоу.

Японскія самалёты зрабілі налёт на станцыю Лінгуань (на чыгунцы Цяньцзінь—Пукоу). У часе налёту забіта 20 мірных жыхароў і зруйнована запалкавая фабрыка.

НОВЫ КАНФЛІКТ ПАМІЖ АНГЛІЯЙ І ЯПОНІЯЙ

ЗБІЕННЕ ЯПОНЦАМІ ДВУХ АНГЛІЙСКІХ ПАЛІЦЭЙСКІХ

ЛОНДАН, 7 студзеня. (БЕЛТА). Агенцтва Рэйтэр паведамляе, што 7 студзеня паліцыя міжнароднага сетльмента (квартала) у Шанхаі прад'явіла пратэст японскім морскім уладам у сувязі са знявагай і збіеннем японцамі двух англійскіх паліцэйскіх чыноў у памяшканні японскага морскага штаба.

Амаль у той-жа самы момант у Шанхаі адбыўся новы выпадак здзекаў над чынамі англійскай паліцыі. Раніцай 7 студзеня англійскі паліцэйскі Тарнер наглядаў, як японскія зойскі абшуквалі кітайскіх вулічных гандляроў. Тарнер быў у гэты час на тэрыторыі англійскай часткі сетльмента. Тарнер заявіў японскім чынам міжнароднай паліцыі, што абыходжанне японскіх войск з кітайцамі — беспрычынна грубае. Тады японскія салдаты ўварваліся ў англійскі сектар, ударылі Тарнера па твару і, уцягнуўшы яго на тэрыторыю японскага сектара, жорстка збілі. Выкліканы на месца здарэння інспектар англійскай паліцыі патрабаваў аслабанення Тарнера. Аднак японцы збілі таксама і паліцэйскага інспектара. Пазней абодва былі аслабанёны.

Камандуючы англійскім гарнізонам у Шанхаі Смолет заявіў японскаму ваеннаму аташэ генералу Харада рэзкі пратэст супроць урывання японцаў у англійскую частку сетльмента і, у прыватнасці, супроць нападу на Тарнера. Смолет папярэдзіў, што любое паўтарэнне такіх выпадкаў можа прывесці да самых цяжкіх вынікаў.

ЗВЕРСТВЫ ЯПОНСКІХ АКУПАНТАЎ

ХАНЬКОУ, 8 студзеня. (БЕЛТА). Газета «Саут чайна Морнінг пост» прыводзіць расказы бачыўшых зверствы японцаў у адным з кітайскіх раёнаў Шанхая — у Ньандао. Уварваўшыся ў гэты раён, японцы прыступілі да пагалоўнага знішчэння ўсіх кітайцаў, якія здаваліся ім салдатамі кітайскай армії. У многіх дамах пасля адыходу галоўных кітайскіх сіл аставаліся групы кітайскіх салдат з «атралаў смерці». Не здолеўшы выбіць кітайскіх храбрапоў з умацаваных дамоў, японцы пачалі падпальваць будынкі. Неўзабаве пажары ахапілі ўсе кварталы горада. Пажары ў горадзе прадаўжаліся звыш трох тыдняў пасля ўступлення туды японскіх войск. Кожную ноч былі чутны залпы — японцы расстрэльвалі непакорных. Прыгожы кітайскі раён Ньандао ператварыўся ў руіны.

БАНКАВЫЯ БІЛЕТЫ НОВАГА ЎЗОРУ 1937 ГОДА

(АД ПРАЎЛЕННЯ ДЗЯРЖАЎНАГА БАНКА САЮЗА ССР)

У бліжэйшы час Дзяржаўным банкам Саюза ССР будуць выпушчаны ў зварот банкавыя білеты новага ўзору 1937 года, дастоінствам у 1, 3, 5 і 10 чырвонцаў.

Кожная купюра адрозніваецца ад другой рознай расфарбоўкай друку ліцавога боку і размерам. На ўсіх білетах у правай палове ліцавога боку змешчан партрэт тав. В. І. Леніна, а на левай палове паказан дзяржаўны герб Саюза ССР.

На адваротным боку білетаў, таксама маючых розную расфарбоўку друку, змешчаны надпісы, паказваючыя дастоінства білетаў, на 11 мовах саюзных рэспублік, уваходзячых у склад Саюза, згодна арт. 13 Канстытуцыі Саюза ССР.

Выпускаемыя ў зварот новыя банкавыя білеты маюць лепшае мастацкае афармленне, у параўнанні з ранейшымі выпускамі.

Зноў выпускаемыя ў зварот банкавыя білеты будуць мець хаджэнне нароўні з цяпер знаходзячымися ў звароце банкавымі і казначэйскімі білетамі ўсіх ранейшых выпускаў. («Правда»).

ХРОНІКА

ПВК СССР зацвердзіў тав. **Бутэнка К. І.** намеснікам народнага камісара цяжкай прамысловасці.

ПВК СССР зацвердзіў тав. **Кузьміна П. В.** намеснікам народнага камісара цяжкай прамысловасці.

ПВК СССР зацвердзіў тав. **Первухіна М. Г.** намеснікам народнага камісара цяжкай прамысловасці.

***

СНК СССР назначыў тав. **Сауціна І. В.** начальнікам Цэнтральнага ўпраўлення народнагаспадарчага ўліку пры Дзяржплане СССР.

СНК СССР назначыў тав. **Дзегцяр Д. Д.** намеснікам начальніка Цэнтральнага ўпраўлення народна-гаспадарчага ўліку пры Дзяржплане СССР.

***

СНК СССР аслабаніў тав. Мішнаеўскага Г. Н. ад работы намесніка старшыні Камітэта загатовак пры СНК СССР

НОВЫ РЭДАКТАР ГАЗЕТЫ «ИНДУСТРИЯ»

ЦК ВКП(б) зацвердзіў тав. **Прамкова А. В.** рэдактарам газеты «Индустрия».

Чырвонаармеец Н-скай часці Кіеўскай ваеннай акругі тав. В. І. Сухуроў — таленавіты мастак. Нядаўна ён закончыў карціну ўласнай кампазіцыі — «Разведка». НА ЗДЫМКУ: тав. Сухуроў ля сваёй карціны. (СФ).

НАСУСТРАЧ XX ГАДАВІНЕ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

ЧЫРВОНААРМЕЙЦЫ-МАСТАКІ

Чырвонаармейскія самадзейныя мастакі, рысавальшчыкі, афарміцелі клубаў, ленкуткоў і чырвонаармейскіх інтэрнатаў часцей Менскага гарнізона вядуць узмоцненую падрыхтоўку да дастойнай сустрэчы 20-годдзя слаўнай Чырвонай Арміі. У часцях распрацоўваюцца планы, эскізы, як лепш, прыгажэй сустрэць свята.

У кожнай часці ёсць адзін, два, а то і некалькі мастакоў-самавучак, якія з любоўю малююць партрэты вялікага правадыра народаў І. В. Сталіна, маршала Совецкага Саюза К. Е. Варашылава, кіраўнікоў партыі, урада, Чырвонай Арміі і лічаць для сябе гэту работу справай гонару і вялікай гордасці.

Сотні партрэтаў правадыроў, вялікая колькасць дакументальных дыяграм аб шчаслівым і заможным жыцці ў СССР, кампазіцый, выдатна выкананых лозунгаў упрыгожаць у дні свята клубы, ленкуткі і інтэрнаты.

У Менскім гарнізоне ў апошні час выяўлен рад здольных і таленавітых мастакоў-самавучак, як тт. Івінскі, Літароўскі, Сяргееў, Зайцаў і інш. Работы 7 байцоў-мастакоў прэміраваны і адзначаны ўзнагародамі і дыпломамі ўрада БССР і Камітэта нядаўна закрыўшайся рэспубліканскай выстаўкі «БССР за 20 год». Цяпер гэтыя самавучкі-мастакі рыхтуюць падарункі слаўнаму юбілею Чырвонай Арміі.

Аб ліквідацыі тэатра імя Вс. Мейерхольда

Камітэт па справах мастацтваў пры Соўнаркоме СССР выдаў загад аб ліквідацыі тэатра ім. Вс. Мейерхольда.

Камітэт па справах мастацтваў пры Соўнаркоме СССР прызнаў, што тэатр ім. Мейерхольда канчаткова скаціўся на чуждыя совецкаму мастацтву пазіцыі і стаў чужым для совецкага гледача.

Гэта выразілася ў тым, што:

1. Тэатр ім. Мейерхольда на працягу ўсяго свайго існавання не мог аслабаніцца ад чуждых совецкаму мастацтву, наскрозь буржуазных, фармалістычных пазіцый. У рэзультаце гэтага, ва ўголу лявацкаму трукацтву і фармалістычным вывёртам, нават класічныя творы рускай драматургіі даваліся ў тэатры ў скажоным, антымастацкім выглядзе, са скажэннем іх ідэйнай сутнасці («Ревизор», «Горе уму», «Смерть Тарелкина» і інш.).

2. Тэатр ім. Мейерхольда аказаўся поўным банкротам у пастаноўцы п'ес совецкай драматургіі. Пастаноўка гэтых п'ес давала скажонае, паклёпніцкае ўяўленне аб совецкай рэчаіснасці, прасякнутае двухсэнсоўнасцю і нават прамым антысовецкім злоныхацельствам («Самоубийца», «Окно в деревню», «Командарм 2» і інш.).

3. За апошнія гады совецкія п'есы зусім зніклі з рэпертуара тэатра. Рад лепшых актораў пайшоў з тэатра, а совецкія драматургі адвярнуліся ад тэатра, заяляваўшага сябе ад усяго грамадскага і мастацкага жыцця Саюза.

4. Да дваццаціголдзя Кастрычніцкай рэволюцыі тэатр ім. Мейерхольда не толькі не падрыхтаваў ні адной пастаноўкі, але зрабіў палітычна варожую спробу паставіць п'есу Габрыловіча («Одна жизнь»), антысовецка скажаючую вядомы мастацкі твор Н. Остроўскага «Как закалялась сталь».

Апрача ўсяго іншага, гэта пастаноўка была злоўжываннем дзяржаўнымі сродкамі з боку тэатра ім. Мейерхольда, прывыкшага жыць на дзяржаўныя грашовыя субсідыі.

У сувязі з усім гэтым, Камітэт па справах мастацтваў пры Соўнаркоме СССР **пастанавіў:**

а) ліквідаваць тэатр ім. Мейерхольда, як чужды совецкаму мастацтву;

б) трупу тэатра скарыстаць у іншых тэатрах;

в) пытанне аб магчымасці далейшай работы Вс. Мейерхольда ў галіне тэатра абмеркаваць асобна.

У ДЫПЛАМАТЫЧНЫМ СВЕЦЕ

7 студзеня ў Маскву прыбыў новы паўнамоцны прадстаўнік Мангольскай Народнай Рэспублікі п. **Самбу.**

На Паўночным вакзале п. Самбу быў спатканы загалчыкам пратакольным аддзелам НК замежных спраў В. Н. Барковым і складам паўнамоцнага прадстаўніцтва Мангольскай Народнай Рэспублікі.

У ШКОЛАХ МЕНСКА ЎСЁ ЯШЧЭ АРУДУЮЦЬ ВОРАГІ

Вынікі работы за першае паўгоддзе вучэбнага года паказваюць, што ў школах Менска яшчэ пралаўжаюць арудаваць ворагі народа і іх пасобнікі, якія ўсе намаганні прыкладаюць да таго, каб зрываць паспяховасць, палітыка-выхаваўчую работу.

Нарада настаўнікаў гор. Менска, якая ўчора адкрылася, прыступіла да падвядзення вынікаў работы першага паўгоддзя. Загалчык гарана таз. Іванішчанка ў сваім дакладзе прывёў рад лічбаў, якія прама выклікаюць трывогу за становішча школ у сталіцы. Абсалютная паспяховасць за 2-гі квартал першага паўгоддзя складае ўсяго 66,3 проц. А лік непаспяваючых за гэтае паўгоддзе дасягае некалькіх тысяч вучняў. У асобных-жа школах, як напрыклад, у 41-ай, паспяховасць складае ўсяго 20 проц. Адна гэта лічба—яркае сведчанне аб варожай дзейнасці ў школе.

Аднак, лічбы, якія прыводзіў дакладчык, яшчэ не адлюстроўваюць сапраўднага становішча ў некаторых школах. Узяць хоць-бы другую школу (дырэктар тав. Чучко). Абсалютная паспяховасць па гэтай школе складае за другі квартал першага паўгоддзя 55,2 проц. Становішча ў школе яўна небяспечнае. Тут працуюць людзі, якія не могуць забяспечыць зыхавання нашых совецкіх дзяцей. Загалчык навучальнай часткі Сержанаў развальвае педагагічны працэс, дрэнна кіруе настаўнікамі і сам не рыхтуецца да ўрокаў. На яго ўроках заўсёды адсутнічае цыкыцыліна. Сержанаў меў сувязь з адным заўзятым ворагам, які накіраваў яго на работу ў гэту школу бясспрэчна не для карысці. Выклікае падазронасць работа другога настаўніка гэтай школы — Валасевіча, які дрэнна арганізуе ўрокі, не змагаецца за навязанне паралку ў класе, выступае супроць правядзення социялістычнага спаборніцтва. Валасевіч — сын папа, меў песную сувязь з заяўлым ворагам народа. Адзін з класаў у гэтай школе рэдзе дачка дзяка і былая жонка папа. Чыстоўская, якая ў сваім «выхаванні» дазяла справу да таго, што ў яе класе выкрываюць контррэволюцыйныя лозунгі.

Зусім дрэнная паспяховасць у 32 школе. Дырэктарам школы працуе Міхалковіч, які не змагаецца за навязанне большэвіцкага паралку, сазейнічае варожай практыцы ў рабоце некаторых «настаўнікаў». Сам Міхалковіч доўгі час меў песную сувязь з ворагам народа, які арудаваў ў Наркамасветы.

Не лепшае становішча і ў 21 школе. Тут у першым і чацвертым класах непаспяховасць за першае паўгоддзе дасягае 10—15 проц. У адным з гэтых класаў 9 вучняў сядзяць трэці год, а паспяхозасць іх з рук вон дрэнная. Класы гэтыя вядуць настаўніцы Ермашкевіч, жонка зыкрытага ворага народа, і Куляшова, дочка папа.

Не ліквідуюцца вынікі шкодніцтва ў школах Менска ў галіне палітычнага выхавання школьнікаў. На гэтым участку мы маем яшчэ рад недапушчальных, антысовецкіх фактаў, якія сведчаць аб адсутнасці дастатковай большэвіцкай пільнасці многіх нашых настаўнікаў. У 48 школе, напрыклад, настаўнік Старыкаў адважыўся прымяніць фізічныя меры ўздзеяння да аднаго вучня. У 5 школе ёсць факты зладзейскіх учынкаў, школьных клічак і распаўсюджвання антышпедагагічных лістовак.

У 28 яўрэйскай школе такое «выхаванне» пайшло далей. Настаўнік гэтай школы Равін, які прыехаў з Польшчы, у дыктоўцы для вучняў 8 класа прапагандуе контррэволюцыйныя сказы, а ў гутарках расказвае антысовецкія байкі. Відавочна, што гэты «настаўнік» нічога агульнага з выхаваннем совецкай дзетвары не мае.

Усё гэта сведчыць аб небяспечным становішчы ў многіх школах сталіцы, аб пралаўжаючайся дзейнасці варожых элементаў і патуранні да іх кіраўнікоў гарана і Наркамасветы.

Нарада настаўнікаў г. Менска павінна асноўную сваю ўвагу накіраваць на канчатковую ліквідацыю вынікаў шкодніцтва, на знішчэнне варожай работы і ачыстку настаўніцкіх кадраў ад варожых людзей, ад пасобнікаў ворагаў і людзей, не вартых насіць ганаровае званне совецкага настаўніка.

***

Учора на вячэрнім пасяджэнні нарады настаўнікаў гор. Менска быў заслуханы даклад наркома асветы БССР тав. Півавара аб комуністычным выхаванні ў школе. Даклад быў надзвычай схематычным і агульным. Тав. Півавараў не адказаў настаўнікам на рад хвалюючых іх пытанняў, не сказаў, як усё-ж трэба арганізаваць выхаванне. Гаварыў даклачык аб «зрухах» і ні адным словам не спамянуў аб тым, што-ж прымае Наркамасветы для ліквідацыі вынікаў шкодніцтва на гэтым адказнейшым участку.

Спрэчкі насілі больш канкрэтны характар. Тав. Кацдан (дырэктар 21-й школы) прама заявіла, што новае кіраўніцтва Наркамасветы і гарана яшчэ не адчуваецца. Нічога добрага ў наладжванні работы яшчэ не відаць. Больш таго, ведаючы пра засмечанасць школы класава-варожымі элементамі, т. Півавараў і загалчык гарана т. Іванішчанка ніякіх мер не прынялі.

Выступаючыя ў спрэчках тт. Шэндаровіч (4 школа), Тэра (29 школа), Карганеўскі (3 школа), Розіна (30 школа) гаварылі аб буйных недахопах, якія ёсць яшчэ ў школах сталіцы, прыводзілі таксама прыклады добрай работы настаўнікаў.

Удзельнікі нарады адмадушна паслалі прывітальную тэлеграму вялікаму правадыру народаў СССР, лепшаму другу совецкага настаўніцтва любімаму Сталіну.

П. ВІХРОЎ.

ВЕСЕЛА ПРАВОДЗЯЦЬ КАНІКУЛЫ

Ад пачатку зімовых канікул піонеры і вучні 33 школы г. Менска весела праводзяць свой адпачынак. У школе абсталёваны пакой для гульняў, пакой культурнага адпачынку, чытальня. Тут піонеры гуляюць на більярдзе, у шахматы, шашкі, лато, даміно, чытаюць свежыя газеты і цікавыя кніжкі.

Піонеры і вучні пры дапамозе настаўнікаў арганізавалі новагоднюю ёлку. На гульнях каля ёлкі прысутнічалі бацькі вучняў. Школа арганізуе калектыўны прагляд кінофільмаў, экскурсіі, вылазкі за горад на лыжах вучняў старэйшых класаў. Настаўніца Рынг правяла экскурсію вучняў у Гістарычны музей і музей Рэволюцыі. Дзетвара была вельмі задаволена цікавай экскурсіяй. Зараз усе зучні рыхтуюцца да агульнагарадскога карнавала школьнікаў. 8 студзеня вучні VIII класа былі ў Беларускім дзяржаўным тэатры, глядзелі п'есу «Вочная стаўка».

Пасля канікул школьнікі з новай энергіяй возьмуцца за вучобу.

М. ШАЛЬКЕВІЧ.

СЕННЯ Ў ТЭАТРАХ І КІНО:

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР, абан. 89—Вочная стаўка. ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА — Дачка радзімы. ПРОЛЕТАРЫЙ — Ленін у Кастрычніку. ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ—Жыць. СПАРТАК—Юнасць. ДЗІЦЯЧЫ ГУЖАВЫ КІНОТЭАТР — 1. Весёлыя падарожнікі. 2. Цудоўны карабель.

Намеснік адказнага рэдактара І. М. ОФЕНГЕЙМ.

ВЫРАЖ і ВЫВЕСЬ

Зацверджаны народным камісарам фінансаў Саюза ССР тав. В. Я. ЧУБАРАМ.

ПРАВІЛЫ

ДОБРААХВОТНАГА КАЛЕКТЫЎНАГА СТРАХАВАННЯ ЖЫЦЦЯ ПРАЦОЎНЫХ

ад 4 студзеня 1938 г. № 6

Адной з буйнейшых перамог працоўных нашай вялікай радзімы з'яўляецца рост матэрыяльнай забяспечанасці працоўных і іх сем'яў. Гэта перамога зашедна ў Сталінскай Канстытуцыі:

«Грамадзяне СССР маюць права на матэрыяльнае забеспячэнне ў старасці, а таксама — у выпадку хваробы і страты працаздольнасці.

Гэта права забяспечваецца шырокім развіццём социяльнага страхавання рабочых і служачых за кошт дзяржавы, бясплатнай медыцынскай дапамогаю, прадастаўленнем у карыстанне працоўных шырокай сеткі курортаў». (Артыкул 120 Канстытуцыі СССР).

Орэод правадзімых партыяй і ўрадам шматлікіх мерапрыемстваў, накіраваных на далейшае паляпшэнне матэрыяльна-бытавога дабрабыту працоўных СССР, вялікае значэнне мае дабраахвотнае калектыўнае страхаванне жыцця.

Калектыўнае страхаванне жыцця, праводзімае па гэтых правілах, з'яўляецца дапаўненнем да социяльнага страхавання па аказанню адначасной матэрыяльнай дапамогі працоўным і іх сем'ям на выпадак смерці ці страты працаздольнасці.

УМОВЫ ЗАКЛЮЧЭННЯ СТРАХАВАННЯ

§ 1. Па дабраахвотнаму калектыўнаму страхаванню жыцця могуць страхавацца — **без ўрачобнага агляду і незалежна ад узросту** — рабочыя, служачыя, калгаснікі, каапераваныя саматужнікі, вучні школ ФЗВ, рабфакаў, тэхнікумаў і вышэйшых вучэбных устаноў, ваеннаслужачыя сяредняга, старэйшага і вышэйшага складу, а таксама малодшага начскладу звыштэрміновай службы і вольнанайманы склад часцей і ўстаноў ГСЧА, Чырвонага флота і НКВД.

§ 2. Кожны працоўны можа страхаваць толькі самога сябе па месцу сваёй працы.

§ 3. На калектыўнае страхаванне жыцця прымаюцца ўсе працоўныя на фабрыках, заводах, у соўгасах, установах, МТС, арцелях і іншых арганізацыях, калі яны ў дзень уплаты свайго першага авансавага ўзносу па страхаванню не знаходзяцца ў водпуску па хваробе.

У калгасах на страхаванне прымаюцца ўсе працаздольныя члены калгаса, якія асабіста сваёй працай за папярэдні страхаванню год выпрацавалі не менш 20 процантаў сярэдняй колькасці працадзён, прыпадаючых на аднаго калгасніка ў даным калгасе, і ў дзень выплаты свайго першага ўзносу (аванса) не знаходзяць ці не вызвалены ад працы ў калгасе па інваліднасці.

§ 4. Страхаванне афармляецца ці ў цэлым па прадпрыемству, установе, соўгасу, МТС, арцелі, калгасу ці па цэхах, звенах, упраўленнях, аддзелах, калгасных ці вытворчых брыгадах і другіх вытворчых звеньях. У адным і тым-жа калектыве можа быць арганізавана некалькі страхавых калектываў і па прафесіях працоўных асоб, напрыклад, у больніцах—калектывы ўрачоў, медсёстраў, сядзелак; у вучэбных установах — калектывы выкладчыкаў, вучняў і т. д.

§ 5. Калектыўнае страхаванне прымаецца ў сумах 500, 1000, 2000, 3000, 4000 і 5000 рублёў на кожную асобу.

Страхаванне заключаецца пры ўмове, калі ў калектыве пісьмова выкажуць жаданне страхавацца ў адпаведную страхавую суму і выплацяць свой першы авансавы ўзнос **не менш 40 процантаў наяўнага складу працоўных.** Усе астатнія працоўныя гэтага калектыва, незалежна ад іх колькасці, якія не пажадалі страхавацца ў прынятую калектывам адпаведную страхавую суму, могуць у гэтым-жа калектыве страхаваць сваё жыццё ў любую меншую суму.

УВАГА. У калектывах, дзе працуе менш 6 чалавек, патрабуецца, каб ўсе работнікі калектыва прымалі ўдзел у страхаванні і страхаваліся ў адпаведную для ўсіх работнікаў страхавую суму. У калектывах з колькасцю працоўных ад 6 да 12 чалавек для арганізацыі страхавання патрабуецца, каб у адпаведную суму страхаваліся не менш 5 чалавек.

§ 6. Страхаванне калектыва прымаецца Дзяржстрахам тэрмінам на адзін год.

Змяншэнне на працягу страхавога года колькасці застрахаваных не парушае дагавору аб страхаванні.

Пасля сканчэння гадавога тэрміну застрахаваныя могуць адновіць сваё страхаванне на наступны год, калі першы ўзнос па адпаведнаму страхаванню выплацяць не менш тае колькасці асоб, якая патрабуецца для заключэння страхавання.

§ 7. Калектыў застрахаваных мае права зміняць раней прынятую ім страхавую суму. Пераход калектыва на павышаную страхавую суму афармляецца з захаваннем усіх умоў, якія ўстаноўлены для заключэння новага страхавання.

Калі працоўны страхаваў сваё жыццё ў адпаведную з калектывам суму і пры пераходзе калектыва на павышаную страхавую суму знаходзіцца ў водпуску па хваробе, ён мае права, будучы хворым, пераходзіць на павышаную прынятую калектывам страхавую суму.

Розныя асобы, застрахаваныя ў меншыя страхавыя сумы, могуць павысіць сваю страхавую суму да размеру страхавой сумы, прынятай калектывам, пры ўмове, калі ў дзень выплаты свайго першага (авансавага) узносу з разліку павышанай страхавой сумы яны працуюць у застрахаваным калектыве і не знаходзяцца ў водпуску па хваробе.

ПАРАДАК АФАРМЛЕННЯ СТРАХАВАННЯ І ВЫПЛАТЫ УЗНОСАЎ

§ 8. Кожны жадаючы застрахавацца папіпен пісьмова паказаць, на якую суму ён жадае застрахаваць сваё жыццё і кага, у выпадку сваёй смерці, ён назначае для атрымання страхавой сумы.

Для атрымання страхавой сумы застрахаваны можа назначыць любую асобу ці некалькі асоб. Застрахаваны мае права замяніць асобу, назначаную ім для атрымання страхавой сумы, другой асобай, падаўшы аб гэтым пісьмовую заяву камісіі садзейнасці дзяржкрэдыту і апчадный справе (камсоду).

§ 9. Кожны, хто выказаў жаданне застрахавацца, выплачвае зборшчыку камсода аванс у размеры не менш квартальнага страхавога ўзносу і распісваецца ў спіску, з указаннем даты выплаты ўзносу.

§ 10. Страхавы ўзнос выплачваецца кожным застрахаваным за год, за паўгоддзе ці за чвэрць года (квартал) наперад у размеры 12 руб. у год з кожнай тысячы рублёў страхавой сумы. Узносы прымаюцца Дзяржстрахам не далей таго тэрміну, да якога выдзелена калектыву страхавое пасведчанне.

§ 11. Працоўныя, не ўключаныя ў страхаванне ў момант яго заключэння, могуць дадаткова ўступіць у лік застрахаваных па іх пісьмовай заяве з захаваннем памянёных вышэй умоў страхавання.

Гэтыя асобы прымаюцца на страхаванне даканца гадавога тэрміну страхавання ўсяго калектыва.

Дадаткова ўступаючыя асобы выплачваюць авансавы ўзнос за час з дня свайго ўступлення ў страхаванне да канца таго тэрміну, за які аплочана страхаванне ўсяго калектыва. За нішчэйні месяц узнос прымаецца ў размеры 1/12 гадавога ўзносу — як за поўны месяц.

§ 12. У 2-дзенны тэрмін пасля сканчэння збору авансавых узносаў камсод абавязан унесці сабраныя сумы ў Дзяржбанк, апчадкасу ці касу райфа для залічэння на рахунак Дзяржстраха з адаць інспектару Дзяржстраха спіскі асоб, выплацяўшых авансавыя ўзносы.

§ 13. Не пазней 15-дзеннага тэрміну з дня паступлення спіскаў інспектар Дзяржстраха абавязан праверыць правільнасць уключэння ў страхаванне розных асоб і афармінь страхаванне калектыва ці адхіліць, калі дапушчаны парушэнні гэтых правіл.

У выпадку няправільнага афармлення страхавання калектыва ці розных асоб інспектар Дзяржстраха неадкладна арганізуе праз камсод зварот няправільна атрыманых сум розным асобам ці ўсяму калектыву, калі яго страхаванне адхіляецца.

§ 14. Інспектар Дзяржстраха афармляе страхаванне выдачай на імя камсода, праўлення калгаса, фабзаўкома ці іншай грамадскай арганізацыі агульнага страхавога пасведчання на калектыў і выпісвае на кожнага застрахаванага пасведчанне па калектыўнаму страхаванню жыцця (адзінай формы).

Інспектар Дзяржстраха ў кожнае пасведчанне на суму выдачанага застрахаваным авансавага ўзносу наклейвае адпаведную страхавую марку, (падпісае гэтыя пасведчанні, накладвае на іх пячатку і пад распіску выдае камсоду для ўручэння іх кожнаму застрахаванаму.

§ 15. Пры атрыманні чарговых страхавых узносаў зборшчык камсода наклейвае ў пасведчанне застрахаванага плацежную страхавую марку, (падпісае гэтыя пасведчанні, накладвае на іх пячатку і пад распіску выдае камсоду для ўручэння іх кожнаму застрахаванаму.

§ 15. Пры атрыманні чарговых страхавых узносаў зборшчык камсода наклейвае ў пасведчанне застрахаванага плацежную страхавую марку, (падпісае гэтыя пасведчанні, накладвае на іх пячатку і пад распіску выдае камсоду для ўручэння іх кожнаму застрахаванаму.

§ 16. Пасля сканчэння збору страхавых узносаў камсод робіць справаздачу аб сабраных сумах перад інспекцыяй Дзяржстраха і здае плацежныя спісі ў інспекцыю, дзе яны захаваюцца ў спецыяльнай справе.

АДКАЗНАСЦЬ ДЗЯРЖСТРАХА

§ 17. Па калектыўнаму страхаванню жыцця Дзяржстрах выплачвае поўную страхавую суму:

а) у выпадку смерці застрахаванага ад любой прычыны;

б) у выпадку пастаяннай поўнай (100-процантнай) страты застрахаваным працаздольнасці, якая вынікае толькі ад нішчэйшага выпадку.

Пры частковай пастаяннай страце працаздольнасці ад нішчэйшага выпадку Дзяржстрах выплачвае столькі процантаў страхавой сумы, на колькі процантаў застрахаваны страціў працаздольнасць.

§ 18. Процант пастаяннай страты працаздольнасці ад нішчэйшага выпадку вызначаецца ў застрахаванага пасля сканчэння лячэння — урачэбна-экспертам ці Бюро ўрачэбнай Экспертызы на аснове інструкцый Дзяржстраха.

§ 19. Дзяржстрах няе адказнасць толькі за пастаянную страту агульнай працаздольнасці застрахаванага, якая адбылася ў перыяд дзеяння страхавання ад нішчэйшага выпадку. За страту прафесіяльнай працаздольнасці Дзяржстрах не адказвае.

§ 20. «Нішчэйшы выпадкам» лічыцца ўсякая раптоўная падзея, выклікаўшая ў застрахаванага пастаянную страту працаздольнасці (інваліднасць), як напрыклад, апёк, абмарожванне, калецтва ад падзення якой-небудзь часы ці падзення самога застрахаванага, ад нападу злымысніка ці жывёлы, удару маланкі і электрычнага току, дзеяння машын і механізмаў ці карыстання ўсякага роду інструментамі, удару трамваем, аўтамабілем, поездам і інш., ці калецтва, атрыманае пры крушэнні іх, сонечны ўдар, раптоўнае атручанне шкодным прадуктамі і матэрыямі і раптоўнае ўдушша шкодным газамі і т. п.

Да нішчэйшых выпадкаў адносяцца таксама нервовыя і псіхічныя захворванні, прайдоўшыя ад перапалоху ці іншага раптоўнага дзеяння.

За страту працаздольнасці ад усякіх іншых захворванняў у застрахаванай асобы, хаця-б і пры выкананні ёю службовых абавязкаў, страхавая сума не выплачваецца. Страхавая сума не выплачваецца і ў выпадку, калі страта працаздольнасці ў застрахаванага адбылася, калі ён рабіў злачынства.

§ 21. Дзяржстрах не выплачвае страхавую суму, калі смерць застрахаванага наступіць у выніку намыслу асобы, назначанай для атрымання страхавой сумы, а таксама калі па суду маемасць будзе канфіскавана ў застрахаванага ці пасля смерці яго — у асобы, назначанай для атрымання страхавой сумы.

§ 22. Адказнасць Дзяржстраха па страхаванню калектыва працоўных пачынаецца з 24 гадзін таго дня, у ямкі будуць здадзены на рахунак Дзяржстраха авансавыя ўзносы, не менш чым за 40 процантаў наяўнага складу работнікаў, выказаўшых жаданне страхавацца ў адпаведную страхавую суму.

Адказнасць Дзяржстраху за дадаткова ўступаючых у калектыўнае страхаванне жыцця пачынаецца з 24 гадзін дня выплаты зборшчыку камсода авансавага ўзносу, калі гэтыя асобы ў момант выплаты ўзносу не карысталіся водпускам па хваробе.

§ 23. Калі пасля сканчэння 15-дзеннага тэрміну з дня атрымання ад камсода спіскаў і збор чарговых страхавых узносаў праводзіцца па кантрольных картках. Кантрольныя талоны марак у гэтых калектывах наклейваюцца ў кантрольныя карткі.

§ 16. Пасля сканчэння збору страхавых узносаў камсод робіць справаздачу аб сабраных сумах перад інспекцыяй Дзяржстраха і здае плацежныя спісі ў інспекцыю, дзе яны захаваюцца ў спецыяльнай справе.

АДКАЗНАСЦЬ ДЗЯРЖСТРАХА

§ 17. Па калектыўнаму страхаванню жыцця Дзяржстрах выплачвае поўную страхавую суму:

а) у выпадку смерці застрахаванага ад любой прычыны;

б) у выпадку пастаяннай поўнай (100-процантнай) страты застрахаваным працаздольнасці, якая вынікае толькі ад нішчэйшага выпадку.

Пры частковай пастаяннай страце працаздольнасці ад нішчэйшага выпадку Дзяржстрах выплачвае столькі процантаў страхавой сумы, на колькі процантаў застрахаваны страціў працаздольнасць.

§ 18. Процант пастаяннай страты працаздольнасці ад нішчэйшага выпадку вызначаецца ў застрахаванага пасля сканчэння лячэння — урачэбна-экспертам ці Бюро Ўрачэбнай Экспертызы на аснове інструкцый Дзяржстраха.

§ 19. Дзяржстрах няе адказнасць толькі за пастаянную страту агульнай працаздольнасці застрахаванага, якая адбылася ў перыяд дзеяння страхавання ад нішчэйшага выпадку. За страту прафесіяльнай працаздольнасці Дзяржстрах не адказвае.

§ 20. «Нішчэйшы выпадкам» лічыцца ўсякая раптоўная падзея, выклікаўшая ў застрахаванага пастаянную страту працаздольнасці (інваліднасць), як напрыклад, апёк, абмарожванне, калецтва ад падзення якой-небудзь часы ці падзення самога застрахаванага, ад нападу злымысніка ці жывёлы, удару маланкі і электрычнага току, дзеяння машын і механізмаў ці карыстання ўсякага роду інструментамі, удару трамваем, аўтамабілем, поездам і інш., ці калецтва, атрыманае пры крушэнні іх, сонечны ўдар, раптоўнае атручанне шкодным прадуктамі і матэрыямі і раптоўнае ўдушша шкодным газамі і т. п.

Да нішчэйшых выпадкаў адносяцца таксама нервовыя і псіхічныя захворванні, прайдоўшыя ад перапалоху ці іншага раптоўнага дзеяння.

За страту працаздольнасці ад усякіх іншых захворванняў у застрахаванай асобы, хаця-б і пры выкананні ёю службовых абавязкаў, страхавая сума не выплачваецца. Страхавая сума не выплачваецца і ў выпадку, калі страта працаздольнасці ў застрахаванага адбылася, калі ён рабіў злачынства.

§ 21. Дзяржстрах не выплачвае страхавую суму, калі смерць застрахаванага наступіць у выніку намыслу асобы, назначанай для атрымання страхавой сумы, а таксама калі па суду маемасць будзе канфіскавана ў застрахаванага ці пасля смерці яго — у асобы, назначанай для атрымання страхавой сумы.

§ 22. Адказнасць Дзяржстраха па страхаванню калектыва працоўных пачынаецца з 24 гадзін таго дня, у ямкі будуць здадзены на рахунак Дзяржстраха авансавыя ўзносы, не менш чым за 40 процантаў наяўнага складу работнікаў, выказаўшых жаданне страхавацца ў адпаведную страхавую суму.

Адказнасць Дзяржстраху за дадаткова ўступаючых у калектыўнае страхаванне жыцця пачынаецца з 24 гадзін дня выплаты зборшчыку камсода авансавага ўзносу, калі гэтыя асобы ў момант выплаты ўзносу не карысталіся водпускам па хваробе.

§ 23. Калі пасля сканчэння 15-дзеннага тэрміну з дня атрымання ад камсода спіскаў асоб, выплацяўшых авансавы ўзнос, інспекцыя Дзяржстраха не аформіць ці не адхіліць страхавання калектыва, то страхаванне ліквідуецца заключаным з дня здачы грошай на рахунак Дзяржстраха і на ўсіх выплацяўшых узносы выдаюцца страхавыя пасведчанні.

§ 24. Пры пераходзе калекты